# ПОДЫХІ ХВІЛІН

**ДЗМІТРЫЙ ШАТЫЛОВІЧ**

# ПОДЫХІ ХВІЛІН

**БЕЛАСТОК 2009**



# ПОДЫХІ МІНУЛАГА

## МЫ НЕ СУСТРЭНЕМСЯ

Мы здаецца не сустрэнемся ніколі,
На вячэру не паставіш мне кулеш.
Разлучылі нас калісь зімой на полі,
І не ведаю, ці ты яшчэ жывеш.
	За сталом мяне ты больш не пацалуеш,
	Не нап’емся мы са шклянкі малака,
	Песні звонкай з-пад Саколкі не пачую,
	Не адчуе рук тваіх мая шчака.
Разлучыў нас нечакана на загонах,
Як ішлі мы ўжо з надзеяю дамоў,
Лейтэнант малы ў шынелі і ў пагонах,
Ён забраў цябе з сабою, як улоў.
	На дарогу ён павёў цябе ў машыну,
	І ад’ехаў сам з табою дзесь на ўсход,
	Я адзін астаўся ў гэтую хвіліну,
	Толькі ад бензіну доўга чуў смурод.
Ты, маёй няволі верная сяброўка,
Доўга ты была яшчэ са мною ў снах.
У маіх на фронце жудасных зімоўках,
У тваіх вачах заўжды я бачыў страх.
	Час аднак залечыў успамінаў раны,
	Бо калі вярнуўся я з вайны дамоў,
	Аб табе пачуў я многія заганы,
	І не меў я вестак ад тваіх бацькоў.
Голас твой цяпер заўсёды ўспамінаю,
Ён звініць мне ў мроях з кожнай стараны,
І хоць аб табе нічога больш не знаю,
Бачу нашы дні няволі і вайны.

## АЛЬБІ[1]

Хаджу па вуліцах прыгожых,
Тут мог хадзіць Тулуз Латрэк[2].
З чорнай чупрынаю прахожы
Прайшоў паблізу, быццам грэк.
І паказаў мне ўніз рукою
На кветнікаў глыбокі роў,
Дзе кумачамі над ракою
Ірдзелі кветкі, быццам кроў.
Быць можа гэта альбігойцаў[3]
Кроў тут у кветнікі ўвайшла,
Каб зганьбіць даўніх іх забойцаў
З-пад ватыканскага крыла.
Калісь, як шчупальцы мядузы,
Крыжовы знішчыў іх паход.
Глядзіць статуя Лаперузы[4]
На кветнікаў чырвоны ўзвод.
Глядзіць на Тарн і на касцёлы
І на музей іх мастака,
Як зіхаціць прад ім наўкола
У сонцы радугай рака.
І ўспамінае час далёкі,
Калі па моры ён блукаў,
Дзе бачыў ліўні, хваль патокі,
І ўсе прыгоды марака.
Не ведаў можа, што калісьці
Лілася тут катараў кроў,
Як Ватыкан мячом ачысціў
Тут ерась з вёсак, з гарадоў.

---

[1] Альбі – горад ў паўднёвай Францыі.
[2] Тулуз Латрэк (1864-1901) – французскі мастак народжаны ў Альбі.
[3] Альбігойцы – сярэдневяковая ерась катараў, на якіх выслаў крыжовы паход рымскі папа Інакенцій III і іх вымардаваў (1209-1216 гг.).
[4] Лаперуз – Жан Франсуа дэ-Лаперуз, французскі мараплавец (1741-1788). Ён нарадзіўся ля Альбі.

## СЦЯЖЫНА ЖЫЦЦЯ

Нарадзіліся мы, каб сцяжынай
Дзесь ісці ў невядомы прастор,
Пераходзіць равы, ручаіны,
Часта дрыгву і горы, і бор.
        Сустракаем заўжды на сцяжыне,
        Часта ворагаў, добрых сяброў,
        І блукаем дзесь з імі ў даліне,
        Між залітых вадою лугоў.
То нас гоні жыцця цешаць вочы,
Залатыя зярняты наўкол,
То нас страшаць жыццёвыя ночы,
Ці халодны між скал сухадол.
        У гады маладыя мы сілы
        Не шкадуем і хутка бяжым,
        Не пужаюць чужыя магілы
        І дзяржаўны бяздарны рэжым.
Там спаткаем сяброўку, як кветку,
Каб з ёй разам па сцежцы  ісці,
І з каханаю пройдзем палеткі
І даліны ўсе ў нашым жыцці.
        Нават можам пайсці ўсёй сям'ёю
        Нейкі час па сцяжыне адной.
        Потым дзеці дзесь позняй парою
        Дабяруцца да сцежкі другой.
Будзем слабнуць пасля з кожным годам,
Ад спякоты шукаць халадка,
І блукаючы ў час непагоды,
Пазіраць на святло маяка.

## СПЕЎ ДЗЯЎЧЫНЫ Ў САДЗЕ

Гучала сапрана дзявочае ў садзе,
У сонечных промнях дрыжэла лісцё
На яблынях, грушах, на вінаградзе.
Іх быццам ад сну абудзіла жыццё.
Святло зіхацела між імі, кіпела,
І пераліваласе гучнай струной.
Дзяўчына хадзіла па садзе і пела,
І захапляла ўсіх цёплай вясной.
Іскрынкі, як кроплі вады ў вадаспадзе,
Ляцелі з яе чарнабровых вачэй,
Яны саграваді расліны ўсе ў садзе,
Каб днём даспявалі між дрэваў хутчэй.
І слухала сонца высока дзяўчыну,
Бо голас яе да нябёсаў дабег,
Адтуль плылі промні шырокай сцяжынай
На яблыні кветачак белых, як снег.
Трымцела мелодыяй дзіўнай навокал
Паветра над кветкамі блізкіх лугоў.
Мільгала сінеючая павалока
Пры рэчцы ў кустах ля яе берагоў.
Гук песні яе захапіў нават птушак,
Вароны заціхлі, замоўк салавей.
Ад гучных яе жартаўлівых частушак
Сядзеў нерухома ў цяні верабей.
Сяляне пачуўшы яе спеў і голас,
З усмешкай ішлі па дарозе дамоў,
А многія з іх захапляліся ўголас,
Дарылі яе рэхам радасных слоў.

## РЭХА ГАДОЎ

Жыццё бажыць, як антылопа
Настрашаная на саванне,
І рэха ад таго галопу
Ляціць праз наша існаванне.
    Яго цяпер яшчэ на старасць
    Мае заўсёды чуюць вушы,
    Ці як чароўную гітару,
    Ці як крык крумкача на грушы.
І з гэтым рэхам успаміны,
Як фільм праходзяць прад вачамі,
Гадоў дзіцячых каляіны
У яркім сонцы і начамі.
    Дрыжу ад рэха крыку ў зяпе
    Гранатавага паліцая:
    Po polsku czysto mów, kacapie,
    Bo się rodzice nie poznają![1]
Я рэха чуў пасля ў эфіры:
Guzika Niemcom nie oddamy![2]
За імі выстралы з марціры,
І выбух бомб, пажары, ямы.
    І гукі танкаў па дарозе,
    А потым гучны спеў „Кацюшы”.
    І раптам з пугай на парозе
    Жандар нямецкі ў капялюшы.
І хутка стук калёс вагонаў,
Язда ў далёкую няволю.
За ёй салдацкія пагоны,
І тупат ног па снежным полі.

---
[1] Гавары чыста па-польску, кацап, бо цябе бацькі не пазнаюць!
[2] Не аддамо немцам гузіка! (крычаў у 1939 г. польскі маршал Эдвард Рыдз-Сміглы)

## У ЗАРАСЛЯХ ЧАРОМХІ

У зараслях чаромхі
Між паркавых алей,
Спяваў вясною звонка
Мне песні салавей.
Сядзеў я ў кветках белых
У цёплы светлы дзень,
І між галін збуцвелых
Яго пабачыў цень.
Замёр я нерухома
І на яго глядзеў,
І думаў, ці свядома
Сюды ён прыляцеў.
Скакаў ён між галінак,
Падобны да дразда,
Глытаў жукоў, лічынак,
І ўскочыў да гнязда.
У зараслях высокіх
Было яго гняздо.
Схаваў яго ад вока
Звяркоў і іх слядоў.
І раптам за хвіліну
Гняздо аставіў ён,
На тонкую галіну
Прысеў, як чэмпіён.
І паляцелі трэлі
Паміж кустоў і дрэў.
Дрыжэлі кветкі ў белі,
Яго пачуўшы спеў.

## НА ІВАНА КУПАЛЫ

Сёння ноч Купалы,
Моладзь ля ракі
Грае на цымбалах
І пляце вянкі.
    Полымем гарачым
    Пырскаюць кастры,
    Цераз верх іх скачуць
    Хлопцы песняры.
Полымя іх быццам
Лечыць ад хвароб,
Бо яго баіцца,
Злы дух і мікроб.
    І сарочкі хворых
    У агні гарацЬ,
    А наўкол танцоры
    Бавяць ля кастра.
І вясёлы ўсюды
Бачым карагод.
Феерверкі-цуды
Радуюць народ.
    Папараці кветку
    Хочуць дзесь знайсці
    І дамоў без сведкаў
    Хутка прынясці.
Будуць тады ведаць
Схованкі зямлі,
І што для суседа
Чэрці прынязлі.
    Ад дзяўчат у рэчках
    Плаваюць вянкі,
    На вянках ад свечак
    Ззяюць аганькі.

## ДАВАЕННАЕ ПАКАЛЕННЕ

Пазнала маё пакаленне
Жах доўгай і цяжкай вайны,
Бізун, кайданы зневаленні
І яд безнадзейнай маны.
Яшчэ да вайны здзек пагарды,
Дзяцінныя душы сцябаў,
Як з кпінай паны з-за мансарды
Глядзелі на нас з-пад ілба.
У школе за родную мову
Аблаяны быў я не раз,
За гэта хадзіў на размову
У школу мой бацька падчас.
Я бачыў бяды адгалоскі,
Зімою людзей табуны.
Хадзілі ад вёскі да вёскі,
Каб выспацца дзесь ля сцяны.
Паны будавалі палацы,
І ў горадзе рой камяніц,
Рабочыя часта без працы
Дзяцей не маглі накарміць.
Усюды хадзілі сяляне
У цёплыя дні басанож,
А ў лапцях па снежным дыване,
І восенню ў буру, і ў дождж.
Яны ўсе гатовілі ежу
У вёсках з свайго талакна,
Сваю нават шылі адзежу
І толькі з свайго палатна.
Жанчыны ўсе пралі і ткалі,
І самі свой сеялі лён,
А з ягад рабілі каралі,
З алеяў – да твару ласьён.

## ДЗІЎНЫ СОН

Сёння прысніўся мне раніцай сон,
Быццам лячу я з табой наўздагон,
За самалётам на доўгім дыване.
На самалёт мы глядзім, там з акон
Чуем чароўны і радасны звон,
Быццам з касцёла на блізкай паляне.
    Раптам званы ў ім заціхлі і хор,
    Грыгарыянскі харал, як віхор,
    Спераду нам заспяваў з самалёта,
    На самалёце заціхнуў матор,
    Ён загарэўся і, як метэор,
    Згінуў унізе, папаўшы ў балота.
І на дыване я толькі з табой,
Бачым пад намі густы дрэвастой.
Раптам мільгнула сяло Белавежа,
З ціхай прыгожай чырвонай царквой,
І з невялікай паблізу ракой,
І на граніцы з шырокім узмежжам.
    Тут мы даўно ўжо з табой не былі,
    Помню тут царскі палац быў калісь,
    Дзе мы блукалі па пекных пакоях.
    Грозна глядзелі са сцен каралі,
    Як па дыванах мы гуртам ішлі
    І захапляліся дзіўнай красою.
Потым пагналі нас ветры на ўсход
І з-за граніцы да нас уразброд
Стрэлы густыя з кустоў паляцелі.
Як дывановы пачаў гарэць спод,
Бухнуў агонь, то пачуўшы смурод,
Хутка прачнуўся я сам на пасцелі.

## СТУДНІ

Ва ўспамінах вясковыя будні
Прад вачамі ўстаюць мне заўжды,
Як няслі да хат людзі са студні
Вёдры свежай халоднай вады.
    Чую часта, як гучна скрыпелі,
    Ля калодзежаў тых жураўлі,
    Як згіналіся на капітэлі
    Дзюбы іх аж да самай зямлі.
Уздоўж вёскі стаялі ля студняў,
Вецер вёдры, як флагі, гайдаў,
На прахожых глядзелі марудна,
І шыпелі здалёк, як удаў.
    Ад вады ў гэтых студнях глыбокіх
    Рэха доўга і гучна ішло,
    Аж дрыжэў жураўлёў дзюб высокі,
    А калодзеж гудзеў, як сапло.
А пасля блізка хат калаўроты
Замянілі старых жураўлёў,
Там цягнулі ваду, быццам з гротаў,
Звёны доўгіх стальных ланцугоў.
    А цяпер з глыбіні агрэгаты
    Трубапровадам пхаюць ваду,
    І плыве ў многіх вёсках дахаты
    Да мыцця, да піцця, на яду.
Студні ўжо зараслі павуцінай,
Часам маюць дзесь іх для кароў.
Асталіся па іх успаміны,
Часта слупы старых жураўлёў.

## ВЁСКА ДЗЯЦІНСТВА

Дзяцінства вёску бачу
Як у чароўным сне,
Удачы і няўдачы
Спаткаўшыя мяне.
Сады і агароды
Квітнеўшыя наўкол
І розныя прыгоды
Між вуллёў злосных пчол.
Дзіцячыя забавы
З сябрамі між палёў,
Сяброваак кучаравых
З пукамі валасоў.
Як з Валяй, Маняй, Воляй
Ішоў я ў агарод,
Пад тычкамі з фасолі
Еў з імі бутэрброд.
Як лезлі мы на дрэвы
Каб вішні  пазрываць,
Іх для  маленькай Евы
У люльцы паказаць.
Яшчэ я бачу хаты
Стаяўшыя тады,
Дзядуляў барадатых
І хлопцаў маладых.
Пасля ваенны подых
Яе ўсю спапяліў.
Старыя ўсе прыгоды
Жыццё здало ў архіў.

## МАЕ ДЗЯДЫ

Сваіх дзядоў ніколі
Не бачыў я ў жыцці,
Запісак аб іх долі
Нідзе не мог знайсці.
    Знайшоў я на пагосце
    Крыж дзеда аднаго,
    Пастаўлены на косцях
    Праз бацечку майго.
Магіла бацькі, маткі
Загінула ў зямлі,
Аб ёй няма здагадкі,
Дзе быць магла калісь.
    А бабку Даменіку
    Я помню як у сне,
    У чорных чаравіках
    На лаўцы пры сцяне.
Што нарадзіла дзеду,
Дачкі тры, пяць сыноў,
Яе нашчадкі следам
Дзяцей радзілі зноў.
    Хоць паўмірала многа,
    Ды большасць з іх жыве
    І розную дарогу
    Прабеглі па дрыгве.
І нейкія з павагай
Пайшлі ў далёкі свет
І нават у Чыкага
Свой астаўляюць след.

## ЧАМУ НЕ ПРЫЯЗДЖАЕШ?

Чаму не прыязджаеш, мілая мая,
Чакае на цябе тут кветак кісяя,
Чакае на цябе тут новы пекны лёс,
Пад бархатам блакітных сонечных нябёс.
    Ты пападзеш сюды, як каралева, ў рай,
    Пабачыш тут сады і сам Бахчысарай,
    Пабачыш тут палац, дзе жыў татарскі хан,
    Дзе быў яго гарэм, дзе ёсць яго фантан.
Пабачыш тут прыгожы і вясёлы Крым,
Пачуеш у грудзях сардэчны цёплы ўздым
І будзем цешыцца жыццём тут удваіх,
Як разам цешацца нявеста і жаніх.
    О, мілая мая, чакаю, прыязджай,
    Пайду па ягады з табой ў чароўны гай,
    Там назбіраем разам кошыкі малін,
    Пабачым, як расце на дрэве апельсін.
Пасля памчымся ў Ялту разам, як страла,
І Лівадзійскі там сустрэне нас палац.
Пакоі царскія пабачым унутры
І што зрабілі ў ім пасля гаспадары.
    Заглянем разам ціха ў царскую царкву
    І прыгажосць яе агледзім наяву.
    У ёй памолімся за царскую сям’ю,
    За ўсіх, хто згінуў тут даўно ў вайну ў баю.
І потым пойдзем у Алупку пехатой,
Па моры катэрам паплаваем з табой...
Чакаюць на цябе тут агарод і дом,
І з імі я чакаю, ноччу, днём.

## ПАРЖАВЕЛЫЯ ЧЫГУНКІ ПАДЛЯШША

Нядаўна яшчэ тут свяціліся рэйкі,
Як стужкі сталёвыя бліскалі ў сонцы,
А шпалы між імі цямнелі, як вейкі.
Па іх цягнікі прабягалі бясконца.
    Па рэйках вазілі ў вагонах тавары,
    І чуліся песні і смех пасажыраў,
    Выглядвалі з вокнаў вучнёўскія твары,
    Салдацкія часта ў вайсковых мундзірах.
На станцыях рух быў і гоман пры касах,
У дні, як былі недалёка базары,
Расходзіўся пах селядца, піва, мяса
І часта ігралі баяны, гітары.
    Цяпер паржавелі сталёвыя рэйкі,
    Амаль не відаць іх зусім пад травою,
    Між імі бярозы растуць, самасейкі,
    Стаяць і смяюцца лістотай жывою.
Самотныя станцыі, быццам страшыдла,
Стаяць адзінокія ў сумнай руіне.
Не відна не толькі людзей, нават быдла,
Яшчэ ў сонцы ззяе на іх павуцінне.
    Бо вёскі наўкол іх амаль апусцелі,
    Не відна дзяцей, каб ішлі дзесь у школу,
    Вясною адны салаўіныя трэлі
    Пацешыць нас могуць тут песняй вясёлай.
Калісь збудавалі на тысячагоддзе
Аж тысячу школ, бо дзяцей было многа.
Пустыя яны, бо ў народзе бясплоддзе,
Нішчэюць у вёсках глухіх пры дарогах.

## ДАЖДЖЛІВЫ ДЗЕНЬ

Я рана ўстаў, каб выйсці на прагулку,
А за акном фантанам льецца дождж,
Дажджлівы дзень імглой закрыў завулкі,
На шкле акна рысуе мне чарцёж.
Мне сумна стала, бо змяніў мне планы
Ужо не раз дажджлівы сакавік,
Мне зноў прыйдзецца ў сценах мураваных
Павесіць мой прагулкі план на цвік.
Як кроплі моцнага дажджу на шыбах,
У нас плыве зігзагамі жыццё,
Яго затрымвае дзесь па дарозе глыба,
І на яе чакаем адплыццё.
Ды адплыве яно і згіне слота
Заззяе сонца і пабачым колер руж,
Адыдзе ў нас згрызота і маркота
І возмемся з ахвотаю за гуж.
Дажджлівы дзень сам прасяджу ў пакоі
І запрагу да працы інтэрнэт,
Каб пабудзіў да ўзнятага настрою
Мяне, паказваючы цэлы свет.
Пакажа мне, што ўжо з-за акіяна
Да нас шалёны крызіс сам паўзе,
Ён крыкам грозным страшыць несціхана
Усе дзяржавы побач па чарзе.
Не чую страху ад яго зласлоўя,
Пенсіянерскі чую аптымізм.
Няхай пужае дзікім беспрацоўем
Ён барацьбітаў за капіталізм.

## ВЯСЕННІ СНЕГ

Пацяплела зіма і ўвесь час,
Нас дажджом, а не снегам дарыла,
Так што хворыя на ішыяс,
Чулі боль у нагах, бёдрах, жылах.
  І раптоўна ля самай вясны,
  Як хацеў сакавік здаць уладу,
  Мы пачулі зімы кайданы,
  Зазвінелі віхры кананадай.
Ноччу вецер шумеў за акном,
Забялела зямля перад домам,
Быццам белае хтось палатно
Разаслаў за сцяною свядома.
  Чуць было, як з вясною зіма
  Бой за ўладу вялі за сцяною,
  Ды зіма ў барацьбе не сама,
  Разам з ветрам вяла бой з вясною.
Перамога была за зімой,
Ранкам снегу мы ўбачылі многа,
Дрэвы ззялі наўкол белізной,
Снег зграбалі плугі на дарогах.
  Ды нядоўга са снегам мароз
  На двары прасядзелі ў спакою,
  Цёплы подых нам вецер прывёз,
  І запахла навокал вясною.
А зіму ўзяў мароз, з ёй уцёк,
І аставілі снег адзінокі.
Ён змяніўся ў ваду і пацёк
У раку, ў вадзяныя патокі.

## БЯЗДОМНЫ

Прыплыў нечакана паўночны мароз,
Які ўжо даўно не пужаў нас зімою.
І вецер за вокнамі, як віртуоз,
Вастрыў аб сцяну сваю грозную зброю.
Засыпаў ён снегам наўкол мураву,
Бялела ўся вуліца побач ад снегу,
Прахожы хаваў пад каўнер галаву,
Дамоў уцякаў хуткім крокам ці ў бегу.
Пад вечар у блок наш бяздомны ўвайшоў
І ў схованцы ў ліфце ён лёг на паперы,
Ды нехта заўважыў яго дзіўны схоў,
Да схованкі хутка адкрыліся дзверы.
Прыйшла гарадская ахова туды,
Казалі яму паказаць дакументы,
Устаць, адпачынку ачысціць слады,
Забраць сваю сумку і медыкаменты.
І выйсці казалі яму на мароз
І ў месцы другім пашукаць адпачынку.
Не ўзрушылі іх яго плач і неўроз,
Якія паказваў ён ім без упынку.
Прасіў, што ахвотна ён пойдзе ў турму,
Ці ў арышце знойдуць яму дзесь начоўку.
Сказалі злачынцам стаць, то на зіму
Ён будзе ў турме мець заўсёды зімоўку.
Бяздомнага вывелі сілай на двор
І ён на марозе атрымаў свабоду.
І ў сэрцы панёс ён вялікі дакор,
Нянавісць, варожасць да ўлады, народу.

## ЛЯСЫ НА ПАДЛЯШШЫ

Яшчэ я помню хвойныя высокія лясы.
Дзе часта я шукаў і ягад, і грыбоў,
Дзе ў цішыні звінелі птушак галасы.
Дзе сустракаў не раз я змей, вужоў, лісоў.
    Закон наш не карае за забойства дрэў,
    Калі ўладальнік лесу дрэва сам забіў,
    Калі з сасновых бэлек збудаваў ён хлеў,
    Калі сасну на дровы зрезаў і спаліў.
Вайна калісьці з'ела вокал многа хат
І спапяліла свірны, клуні і хлявы,
Да адбудовы іх пайшоў лясны субстрат.
Хоць парадзеў лес моцна, быў далей жывы.
    Лес рэзалі і бэлькі пхалі ў гарады
    На пабудову новых блокаў і дамоў.
    І ў горад уцякаў вясковец малады,
    У вёсцы астаўляў сваіх старых бацькоў.
Старэлі хутка вёскі без малых дзяцей,
Ля хат іх паўставала толькі цаліна
І вырастаў на ёй лес дзікі самасей,
Куды цяпер не ўвойдзе плуг, ні барана.
    Сяляне часта самі там садзілі лес,
    Дзяржава ім давала саджанцы, барыш.
    І набірае сілы лес, як Геркулес,
    Ён вёску ўсю займе, астанецца сам крыж.
Падляшша хутка пушчай дзікай зарасце,
А людзі толькі будуць жыць у гарадах,
І пры дарогах воўка ўбачым мы часцей,
Нас летам прывітае пахам рэзеда.

## ШУКАЛІ БРАМ РАЮ

Шукалі людзі ў цемры ліхтара
З надзеяю, што ён для іх заззяе,
Пакажа, дзе высокая гара
Дарогу засланяе да брам раю.
　　Яны яго шукалі цэлу ноч,
　　Так як іголкі ў цёмным стозе сена,
　　Зайшлі ў пячору вузкую наўзбоч,
　　Дзе ногі забрудзілі да каленяў.
Пасля папалі многія ў дрыгву,
Яна ўцягнула першых з галавою,
Затрымаліся ўбачыўшы саву,
Ёй зрэнкі ярка ззялі над вадою.
　　Пайшлі назад, папалі ў дзікі бор,
　　Там забівалі іх ваўкі, мядзведзі,
　　Ды ап’яняў іх пахамі чабор
　　І лесу шум, як гукі звону з медзі.
Над небам месяц раптам, як ліхтар,
Ім засвяціў і паказаў дарогу
І прад сабой пабачылі гушчар,
За ім гару падобную да стога.
　　І ў стоме абыходзілі гару,
　　Далей ісці ім не хапала сілы,
　　Схаваўся месяц ім за хмар кару,
　　Як за арліныя на небе крылы.
Калі ж заззяў зноў месяц, як вальфрам,
Пераканаліся яны ўсе скора
Што за гарой няма да раю брам,
А возера глыбокае, як мора.

## ЯНЫ ПАВЕРЫЛІ

Пасля гадоў згрызоты і маркоты
У палітычных вычварных аковах,
Пасля нішчэння цэркваў і прыгнёту,
Ды школ закрытых з беларускай мовай.
        Пясля злых чутак аб Картуз Бярозе
        І відаў беспрацоўных на дарогах,
        Блукаючых зімою на марозе,
        Каб выспацца ў саломе на падлогах.
Пасля іх безнадзейнага чакання
На лепшы лёс, пагоду і ўраджаі,
У роспачы паверылі сяляне,
Што ім нясуць з усходу караваі.
        Што ім дадуць свабоду і дастатак
        І мову родную ў бясплатных школах,
        Што згіне ім шарварак і падатак,
        Што будуць жыць шчасліва і вясёла.
І ў нейкіх вёсках ставілі сяляне
Ім прывітальныя пры ўходзе брамы.
Прыйшло аднак, як ноч, расчараванне,
Як ад тавараў апусцелі крамы.
        Як паявіліся чаргі ля крамаў,
        Як сталі выганяць людзей да працы.
        Калі наўкол змянялі панараму,
        Калі тварылі агітпункт на пляцы.
Калі ля Буга людзям, як магілы,
Капаць казалі дот ці дол глыбокі,
Калі вывозілі сялян насілу
Дзесь у тайгу ці ў Казахстан далёкі.

## ЯНА ГОЛАСНА ЦЕШЫЦЦА

Забыла яна на гадзіну маркоты
І голасна стала смяяцца да люстра,
Прыйшла да яе на хвіліну ахвота,
Каб выцягнуць з шафы чароўнае футра.
Глядзіць на яго з захапленнм дзявочым
І гладзіць рукою яго з хваляваннем,
Смяецца яна, зіхацяць яе вочы,
Бо ўспомніла раптам з каханым спатканне.
Бо помніць далёкія ў футры пяшчоты
У моцны мароз у высокіх Радопах
І іх пацалункі між снежнай слізготы,
Паездкі зімою па горах Еўропы.
Накінула футра яшчэ раз на плечы,
Стаяла прад люстрам, глядзела з уздымам.
Яе смех вясёлы ў той час быў дарэчы,
Бо чулася там, як княгіня, магчыма.
Іскрылася футра пад яркаю лямпай,
Здавалася ёй, што там ззяюць брыльянты,
За пекнай усмешкай яе, як за рампай,
Звінелі ёй зубы, як ноччу, куранты.
На шыі вясёлкай бліскалі каралі
І твар у яе маладзеў з захаплення.
Пад голасны смех яе грэбень са сталі
Дрыжаў на яе галаве са здзіўлення.
Прад люстрам сама танцавала хвіліну,
Глядзела на футра і збоку, і ззаду...
Жахнулася, ўспомніла ў горах ільдзіну,
Якая смяротную мела прынаду.

## СТАРЫЯ ПЕСНІ ПАДЛЯШША

З успамінаў запоўненай чашы,
Як дзень скрыўся пад ночы крыламі,
Паліліся мне песні з Падляшша,
Меладычнымі ў сне ручайкамі.
    Маладыя я бачыў дзяўчыны,
    Як спявалі прыгожа ля хаты
    На сяброўкі сваёй імяніны,
    Памагаў ім яе дзед вусаты.
Сто гадоў ёй у песні жадалі,
Жаніха дзесь знайсці маладога,
У акне на ёй ззялі каралі,
Яе вочы паглядвалі строга.
    Ёй у рукі далі букет кветак
    І тады твар яе стаў вясёлы,
    Пажадалі ёй шлюбу і дзетак,
    Каб яе баранілі анёлы.
І пасля разам з ёй крок за крокам
З гучнай песняй гулялі па вёсцы.
Гукі песень ляцелі, як сокал,
Па блакітнай у небе дарожцы.
    І звінелі іх гукі далёка,
    На лугах, на палях, над лясамі,
    Аж дрыжэлі ўсе сцены навокал,
    Меладычнымі іх галасамі.
Я прачнуўся, цудоўныя гукі,
Як вясной салаўіныя трэлі,
Пра каханне, пра смуткі разлукі
Вельмі доўга ў вушах мне звінелі.

## РАЧНАЯ ПЕРАШКОДА

Густая ноч, навокал снег,
Замерзлая зямля пад намі,
Мы блудзім, страціўшы начлег
Дзесь за варожымі дратамі.
　　Бяжым, не ведаем куды,
　　Бяжым праз скібы і баразны.
　　За намі вёска і сады,
　　Фашыст з вінтоўкай, вельмі грозны.
Уцёк удалы, ды далей
Нас невядома што чакае,
Нас страшыць нават цень людзей,
Істота кожная жывая.
　　Далёка часам на шашы
　　Заззяе фара ад машыны,
　　А так не відна ні душы
　　І шчыпле вушы халадзіна.
І раптам бачым у імгле
Раку шырокую прад намі,
Плыве здаецца ў ёй жэле,
Глядзіць халоднымі вачамі.
　　Ідзем налева ўздоўж ракі,
　　Каб абмінуць дзесь перашкоду,
　　Сустрэць дзесь хочам мост якісь,
　　Прыгодны нам да пераходу.
І бачым хутар за ракой
І над вадой, як стужку, кладку.
Шчасліва мы прайшлі па ёй,
Каб новыя сустрэць выпадкі.

## У СНЕ БАЧУ РОДНУЮ ВЁСКУ

Мне родная вёска тут сніцца і хаты
Якія я бачыў яшчэ да вайны
І вішні ля хат і платы быццам краты
І прызбы зімою ля кожнай сцяны.
Хат большасць пакрытая шэрай саломай,
На стрэхах каміны чарнелі здалёк
І ранкам дымілі яны і дым строма
Да неба спяшаўся, дрыжэў як шнурок.
Два шэрагі хат з лугавым наваколлем
Стаялі ўздоўж бруку, пры іх журавы,
А летам над імі шумелі таполі.
Ахоўвалі іх, як сям'я вартавых.
За кожнаю хатай стаяў хлеў з худобай,
Далей за хлявамі бывалі сады,
Пасля агароды цвілі, як аздобы.
А потым цягнуліся пунь два рады.
Драўляныя сцены ўдзень ззялі бялілам,
Якое з-пад Мельніка жыд прысылаў,
Святло ноччу з вокнаў плыло, як з кадзілаў,
Ад газавых лямпаў на шэрых сталах.
У хатах я рэдка пабачыў дзесь ложак,
Раскладвалі дошкі, на дошках сяннік,
Сабака меў будку, на шыі аброжак,
І бегаў на прывязі ночы і дні.
У хатах я часта не бачыў падлогі,
А толькі гліняны патрэсканы ток.
І помню высокія ўсюды парогі,
Як пахлі навокал цыбуля, часнок.

## У ГРЭЦЫІ

У чорным бяздонні раі светлых зорак
Мільгаюць праз дзіркі разбітых аркад.
Як рыцар у шлеме, ў імгле шэры ўзгорак
Глядзіць дзесь далёка на нейкі парад.
        А ноч адплывае шырокаю рэчкай,
        Яе забірае якісь параход,
        Святло на ім бачу слабое, як свечка,
        Яно адплывае з ім недзе на ўсход.
І судна малое гайдаецца ў хвалях,
Зыходзіць на бок, каб мінуць параход,
Мінае яго пад мастом блізка паля,
Здаецца прабегла ад берага ўброд.
        Чарнее рака, як густая аліва,
        Яе асвятліла са ўсходу святло,
        Цячэ і гайдаецца ў бляску цярпліва
        І ззяе ў праменях, як лёд, або шкло.
Урэзаўся ў неба мост цёмным металам,
Тырчаць на крыжовых каленах кліны,
Іх вострыя пікі здалёк, як кінжалы,
Глядзяць і на ветры звіняць, як званы.
        Па мосце праходзяць маўклівыя людзі,
        Ідуць на дарогу між дзікіх кустоў,
        Насупраць іх едзе араб на вярблюдзе,
        Вярблюд ад уцехі махае хвастом.
На ўсходзе ўжо глянула сонца з-за горкі,
Заззяў ад праменяў увесь краявід,
Схаваліся ў небе маленькія зоркі,
А ўзгорак высока блішчыць, як гапліт.

## ВЫГНАННЕ З АЙЧЫНЫ

Лёс выгнаў бізуном мяне з айчыны,
Заставіў там аставіць родны дом,
Бацькоў, сястру, лугі, палі, даліны,
Лясы, царкву, куды хадзіў пяшком.
    Пагнаў мяне ў далёкую чужыну
    І змусіў жыць паміж чужых людзей,
    І ў моцную няволі кажурыну
    Папасці ў безнадзейны час падзей.
Калі вярнуўся ў спаленую вёску,
То родны краявід мне стаў зусім чужы,
Вайна змяніла песняў адгалоскі,
Не мог знайсці  там для сябе мяжы.
    І лёс кідаў мяне без супраціву,
    Як вецер ліст, далёка ад граніц.
    І падаў я дзесь на чужую ніву,
    Паміж чужых дамоў і камяніц.
І на чужыне запусціў я корань
І стаў расці паміж чужых раслін
Знайшлася там жыццёвая апора
І з ёй лагодны стаў мой каранцін.
    І перастаў я быць тут пустазеллем,
    Знайшоў другіх падобных да сябе
    І не чакаю дзесь на наваселле,
    Не адплыву адсюль, як карабель.
Тужу тут часта  за старым Падляшшам,
Ды не вярнуся жыць у сад яго.
Чужына ўжо даўно мяне не страшыць,
Хаця не верыў я ў яе багоў.

## РАСЧАРАВАННЕ

Мы вольнасці чакалі ў цьме няволі,
Выглядвалі яе мы ў кайданах
І слухалі, ці блізка ў наваколлі,
Не крочыць з гукам радасці да нас.
    Чакалі мы з надзеяю і з мрояй
    Што з перамогай з’явіцца яна
    І знішчыць ворага сваёю зброяй,
    А нам закончыцца няволя і вайна.
Што вернемся дамоў мы вельмі хутка
Сустрэнемся ўсе з роднымі, з сям'ёй,
Закончацца для нас знявагі, смуткі,
І прыйдзе з вольнасцю ў жыцці спакой.
    Ды вызваленне прыляцела з жахам,
    Наўкол грымела ад гармат зямля,
    Хаваліся ў падвалах мы ад сраху,
    Смяротная гразіла нам пятля.
І замест вольнасці прыйшла няволя,
Мы горшыя пачулі кайданы,
Ад вызваліцеляў не чулі мы патолі,
А толькі недавер і пошукі віны.
    Паслалі многіх на вайну з вінтоўкай,
    Дзе гінулі ад куль і ад хвароб,
    Другія ў лагеры папалі на зімоўку,
    Дзе нішчыў іх і голад і мікроб.
За Куйбышаў загналі на праверку,
З няволі некалькі маіх сяброў,
Сустрэлі зверства там замест цукеркаў,
Ніколі не вярнуліся дамоў.

## НАДЗЕЯ

Яна прыходзіла ў няволі, ў страшны час,
Калі здавалася, што кайданы навекі
Мяне скавалі і мой казачны Пегас
Мне не паможа перажыць дні небяспекі.
        Прыносіла яна мне мары, што яшчэ
        Нам лопнуць кайданы і вольнасць, як вясёлка,
        Зяззяе нам і згіне грозны наш кашчэй,
        Які ў той час нас мучыў, як тыран, без толку.
Надзея ёсць сяброўкай нашага жыцця,
Прыходзіць з дапамогаю ў часы трагедый,
Ёсць лекам на хваробы смутку пачуцця,
Ратункам на сустрэўшыя ў жыцці злыбеды.
        На досвітку прыходзіць весела да нас,
        Нас падбадзёрвае, каб мы не чулі жаху,
        Рукою мягкай і бліскучай, як атлас,
        Нас гладзіць, каб прапалі ў нас сімптомы страху.
Глядзіць сардэчна на наш смутак, непакой,
На нашы ў працы ўсе жыццёвыя няўдачы.
І дарыць нам бальзам на радасць і спакой.
Як сонцаззяе промнем ясным і гарачым.
        Калі стае нам вельмі цёмна на душы,
        Калі нічога прад сабою больш не бачым,
        Яна засвеціць і пакажа бляск шашы,
        Дарогу новую, дзе нас чакае ўдача.
Як ходзіць нават за табою горкі лёс,
Не траць надзеі ты ў сваім жыцці ніколі,
Хай над табою лётае, як альбатрос,
Надзея, што салодкім стане лёс паволі.

## МОЙ „ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ”

Мы цягнікам вярнуліся з Берліна,
Нас прывялі на голыя ляжанкі.
Была ўжо ноч і позняя хвіліна,
Калі далі мне хлеба паўбуханкі.
        Заснуў я ў шынялі на голых нарах,
        Мне сніліся бацькі ў маёй айчыне.
        Збудзілі нас трубой, як да пажару,
        Каб абвясціць канец вайны ў Берліне.
Ура! – ўсе закрычалі з цэлай сілы
І зноў ляглі і спалі мы да ранку.
Мне сніліся салдацкія магілы,
Сустрэчы з санітаркамі на ганку.
        Мы мелі вольны дзень, „дзень перамогі”,
        І серада была ў нас, як нядзеля.
        Паміж казармаў сцежкі і дарогі
        З цікавасці за дзень мы аглядзелі.
А потым восем месяцаў блуканняў,
Спаннё ў кустах на полі без пасцелі,
Салдацкіх муштраў, беганняў, стралянняў,
Каб ногі ўсім пад вечар адранцвелі.
        І з Алянштайна я папаў у Вільню,
        А з Вільні ў Менск і пад Бабруйск у вёску,
        Пражыўшы там салдацкую курыльню,
        Закончыў службу я ў савецкім войску.
Шчаслівы я вяртаўся цераз Гомель,
Дзе дзень чакаў я цягніка да Брэста.
Дамоў спяшаў, не паддаваўся стоме.
Мяне сустрэў дом цёпла, як нявеста.

## СУНІЦЫ

За полем зялёным пшаніцы
Сасновы і цёмны рос лес,
Вясною ў ім кветкі суніцы
Бялелі, як снежны кампрэс.
        Абселі зямлю ўсю пялёсткі,
        Як крылы малых матылькоў,
        Глядзелі з-пад белай прычоскі
        Зялёныя вочкі лісткоў.
Рассыпаў пасля моцнны вецер
Пялёсткі ад кветак наўкол,
Там, быццам зялёнае вецце,
Засыпаў пшанічны памол.
        Ды выйшаў з-пад крылаў тых кветак
        Як гузікаў, шарыкаў рой,
        Як сотні малых бранзалетак,
        Там зеленню ззялі жывой.
Ды шарыкі ўсе пунсавелі,
Ружовы паказвалі бок,
У сонцы штодзень больш ірдзелі,
Людскі захапляючы зрок.
        Прывабілі хутка да ягад
        З каўшамі прыгожых дзяўчат,
        Збіралі яны іх з павагай,
        І дома суніц мелі шмат.
Рабілі з іх сокі і лекі
Ад многіх вядомых хвароб.
Хацеў іх зімой для бяспекі
Мець кожны ў сяле хлебароб.

## СУСТРЭЧА З М.К.

У стыхіі юнацкіх гадоў
Ён заўсёды быў сябрам маім,
Мы аставілі многа слядоў
На жыццёвых шляхах разам з ім.
    Іх аставілі ў школах адных,
    У тых самых старых цягніках
    І ў тым самым сяле ў час вайны.
    Нейкі час быў падобны ў нас шлях.
Не пазнаў ён аднак кайданоў
На чужыне, на прускіх пясках,
Не пазнаў ён салдацкіх штаноў
І акопаў з штыком у руках.
    Ды пасля мы сустрэліся зноў
    І вучыліся ў школе адной,
    На Падляшшы між блізкіх сяброў
    І далёка над самай Нявой.
Пасля школы раскінуў нас лёс,
Ён на розныя пхнуў нас шляхі,
Ён загнаў нас пад розны адкос
І нам розныя даў катухі.
    Мала ведалі мы аб сабе,
    Я аб сябры нічога не знаў,
    Бо ў жыццёвай маёй барацьбе
    Непрыемных сустрэў многа спраў.
І вось помнік ягоны ў траве
Я на могілках сельскіх пазнаў
І пабачыў, што ён не жыве...
Побач толькі шумела сасна.

## ТАЛІСМАН

Цёмнай ноччу ў акопе глыбокім,
Як сядзеў я і слухаў  гармат,
Што гудзелі за рэчкай далёка,
Падышоў блізка нейкі салдат.
        Ён прысеў і, падаўшы мне руку,
        Даў мне вузлік схаваны ў саф'ян
        І сказаў, што жыцця ў ім заруку
        Падарыў, як малы талісман.
Адышоў ён у змрок чорнай ночы,
Я ніколі яго не сустрэў.
Помню голас яго, як жаночы,
І шэпт дзіўны падобны на спеў.
        Крыжык быў у чырвоным саф'яне,
        Медны крыжык з Ісусам Хрыстом.
        З той пары я з маім талісманам
        Перажыў бліскавіцы і гром.
Перажыў у ваенным шпіталі
З ім лячэнне кантузій і ран,
З ім праехаў вялікія далі
Цягнікам, як на возе цыган.
        І вярнуўся з ім з доўгіх блуканняў,
        У свой дом, адкуль выгнаў тыран,
        І даехаў са мной у саф'яне
        Мой салдацкі малы талісман.
Талісман мой не быў чарадзеям,
Бо мяне не збярог ён ад ран,
Ды даваў мне на фронце надзею,
Што прайду разам з ім ураган.

## БАЛАТОН

Мне здаецца, што быццам учора
Я прыехаў у летні сезон,
Пад венгерскае светлае мора,
Дзе назвалі яго Балатон.
Хоць славяне назвалі Балотным
Гэта возера вельмі даўно,
То яно стала  месцам курортным,
Бо ў глыбокай вадзе відна дно.
Бранзавеюць тут людзі ад сонца
І купаюцца ў цёплай вадзе,
Дзетвара весяліцца бясконца,
Скача з мола ў ваду па чарзе.
Побач возера дахі гатэляў
Ззяюць шапкамі, быццам грыбы,
І дзесяткі машын ля матэляў
Ціха бегаюць, як галубы,
У акно ў мой пакой у гатэлі
Люстра возера свеціць, як снег,
І вітае сцяблом пустацелым
Шматгадовы зялёны трыснег.
Як сюды не прыбеглі мадзяры,
Тут славянскіх князёў быў урад
Блізка вёскі старой Залавара,
Іх сталіцаю быў Блатнаград.
Там калісь быў Кірыл і Мяфодзій,
І там сёння іх помнік стаіць.
Доўга памяць не гіне ў народзе
Да старых хрысціянскіх крыніц.
Бо мадзяры прыйшлі нечакана
З азіяцкай зямлі, як таран,
Захапілі ў баях без пашаны
Навакольнае княства славян.

## САМАЛЁТЫ

Калісь стаяў я з лустай хлеба,
Ля сажалкі, дзе рос чарот,
І першы раз пачуў на небе
Гудзеўшы зверху самалёт,
        Ён быў маленькі быццам муха
        І астаўляў дым, як шпагат,
        І запішчаў ён, як квактуха,
        Якая кліча куранят.
На здымках я пазнаў у школе,
Што ў самалеце ёсць пілот.
І раз на лузе блізка поля
Пабачыў я ўвесь самалёт.
        Бо захацеў пілот наведаць
        Паблізу нас сваіх бацькоў,
        Прысеў, каб з імі паабедаць,
        І адляцець кудысьці зноў.
Пасля я ўбачыў бамбавозы,
Якія свой смяротны груз
Кідалі ўдзень на паравозы,
Будынкі замянялі ў друз.
        Тады ля вёскі нечакана
        Прысеў знішчальнік між галін,
        Пры ім я быў ужо ад рана,
        Калі пілот шукаў бензін.
Пасля лятаў я самалётам
У Варну, Дэлі і Дубай,
І даляцеў Аэрафлотам
Раз у Калькуту і Бамбей.
        Быў з ім у Адлеры, ў Ташкенце.
        З Баку ляцеў у Ерэван,
        Як я блукаў па кантыненце,
        Мне памагаў аэраплан.

## ШУКАННЕ ЛЁСУ

Я доўга шукаў па дарогах і сцежках
Майго невядомага лёсу ў жыцці,
Спярша я шукаў у айчыне з усмешкай,
Дарос і яго там не мог я знайсці.
Папаў на чужыну, ў варожых прытонах
Блукаў і нідзе там яго не сустрэў,
Не бачыў яго я ў салдацкіх пагонах
Ні ў снежных акопах, ні ў лесе між дрэў.
Яго не спаткаў я ў ваенным шпіталі,
Дзе бачыў чужыя я раны і кроў,
Як быў пад Бабруйскам у аўтакварталe,
Таксама там лёсу свайго не знайшоў.
Калі я вярнуўся ізноў у айчыну
Глянуў я назад і пазнаў за сабой,
Што лёс мой заўсёды маёю сцяжынай,
Хадзіў, як мой цень, безупынна за мной.
Памог ён мне выбраць, якою дарогай
Павінен далей я наперад ісці,
І быў ён заўсёды маёю падмогай
У розных хвілінах, у цяжкім жыцці.
Мяне заахвоціў схапіць руль вучобы,
І ім кіраваць аж ля самай Нявы,
Памог там шчасліва пражыць без хваробы,
З дыпломам вярнуцца здаровым, жывым.
Лёс мне памагаў праз гады ў маёй працы.
Памог, каб не быць мне ў жыцці аднаму.
Хоць я не жыву, як багач, у палацы,
За шлях мой жыццёвы я ўдзячны яму.

## СПРАДВЕЧНЫЯ ЎСПАМІНЫ

Пражытымі ўспамінамі я доўгі час жыву,
Шукаю іх растаптаных у пыле забыцця,
Калі знайду паміж бабуль знаёмую ўдаву,
То частку запішу падзей з яе сцяжын жыцця.
Яны запісаныя ў кнізе доўга будуць жыць,
І могуць перайці ў імгле ў наступнае стагоддзе.
Пакуль мне Парка не прарве маю жывую ніць,
Увекавечваць я хачу падзеі аб народзе.

У вершах я калісь пісаў аб полацкіх князях,
Аб іх спрадвечных подзвігах, аб сцежках барацьбы
За вотчыну, за свой народ, за вольны родны дах,
Як вораг іх змушаў тады ставаць з ім на дыбы.
Таксама аб былых княгінях я пісаў не раз.
Яны праславілі народ наш, нашую краіну,
Хачу, каб быў аб іх падзеях доўгі пераказ,
Каб жыў заўжды ў народзе і ніколі не загінуў.

Спрадвечныя ўспаміны нашых продкаў іх падзей
Насуперак пагрозам, хай згуртуюць наш народ,
Пакажуць ім, куды іх шлях свабоды давядзе,
Скіруюць іх да мэты, як праменні светлавод.
Яны ім растлумачаць, хто ёсць вораг, а хто брат,
Хто закаваў іх і трымаў у кайданах няволі,
Хто дапаможа і дзе будзе добры мецэнат,
Хто пакіруе ўсю краіну да шчаслівай долі.

## РЭМІНІСЦЭНЦЫІ

Я не сумую, што пражыў дзесяткаў восем год,
Я не журуся, што маршчыны, быццам камары,
Абселі рукі, твар і шыю знізу дагары,
Бо іх не чую, каб кусалі, хоць іх  цэлы ўзвод.
    Аднак смуткую, як марнеюць дзесь мае сляды,
    Як зарастаюць хмызнякамі стужкі каляін,
    На тых дарогах, дзе калісь блукаў я сам адзін,
    Ці з сябрам, ці з сяброўкаю, як быў я маладым.
Дзяцінства я яшчэ пражыў, як быў капіталізм,
Пазнаў яго ўсе вартасці, пазнаў яго бяду.
Пасля з чырвонай зоркаю салдатаў чараду
Пабачыў і даведаўся, які ёсць камунізм.
    Я чуў фашысцкае здзічэнне ў цяжкіх кайданах,
    Якія на чужыне я насіў праз тры гады,
    Каб потым з аўтаматам адбіраць ім гарады,
    Чакаць калі закончыцца насілле і вайна.
І зноў я прыстасоўваўся да новага жыцця,
Якое, хоць і цяжкае нядрэннае было,
Мяне з цячэннем рэчкі ўздоўж нясло маё вясло.
Не нюхаў я смуроду палітычнага гніцця.
    Ва ўзросце пенсіённым зноў прыйшоў капіталізм,
    Які мяне не страшыў беспрацоўем, як другіх.
    Пасля дзён эйфарыі наступіў жалобны ўздых,
    Ён часта пераходзіў у грамадскі фанатызм.
Цяпер ужо я маю час, мяне гукае свет
І ў ім я бачу зло навокал, хцівасць і ману,
Крычу, ды голас мой малую мае ў ім цану,
Бо ў свеце зла не знішчыць наймудрэйшы ў ім паэт.

## ВАРШАВА

Калісь на здымках недзе ў кніжках
Варшавы бачыў я фрагменты,
Я адчуваў у снах іх блізка,
Як цудны бляск з другога свету.
    Калі ў акопах і канавах
    Блукаў нявольнікам я ў катаў
    Я чуў, як гінула Варшава
    Ад бомб, снарадаў і гранатаў.
Калі пабачыў я руіны
Яе будынкаў і палацаў,
Не знаў, што лёсу каляіны
Між іх мне знойдуць месца працы.
    Мяне ў ёй перасталі страшыць
    Без шыб пустыя аканіцы,
    І з вёскі беднай на Падляшшы
    Я стаўся жыхарам сталіцы.
Як фенікс ажыла Варшава,
Цягнула вуліцы, як стужкі,
І праз гады я вельмі жвава
Стварыў гняздо ў ёй, быццам птушка.
    І вылятаю, як на вырай,
    Туды, дзе я правёў дзяцінства,
    І ўспамінаю пасажырам
    Цяжкое ў маткі мацярынства.
Пабачу там яе магілу,
А на капліцы крыж іржавы.
Адтуль  вяртаюся насілу
Сюды ў сваё гняздо, ў Варшаву.

## НОЧЧУ ЗА ВЁСКАЙ

Мы выйшлі ноччу за сяло,
Як месяц нам сваё крыло
З-за хмары ў небе паказаў.
Пабачылі мы поле, луг,
Далёкі лес, хат цэлы круг,
Пад лесам круглы срэбны стаў.
Вось стужкай глянула шаша,
Быццам заззяла ў ёй душа,
Заве нас бляскам да сябе.
І перапёлкі гучны спеў,
Да нас аж з лесу даляцеў
І зачырыкаў верабей.
Бліснула зорка і да нас
Ляцела з неба нейкі час
І згінула ў начной імгле.
Хацелі мы яе злавіць,
Ды толькі залатую ніць
Мы ўбачылі на ночы шкле.
Ды згінуў месяц зноў між хмар,
Залез за іх, як качагар
Дзесь у кацельні за кацёл.
Над вадакачкаю здалёк
Гарыць, як кветка, аганёк,
Чырвонай лямпы арэол.
І ў гэтай цемры я з табой
Стаім, глядзім уверх з тугой,
Калі зноў месяц выйдзе з хмар.
Хачу пабачыць поле, луг,
Далёкі лес, хат цэлы круг,
І твой вясёлы пекны твар.

## ЦЕРАБУНЬ

У мроях бываю на рэчцы Лясной,
Стаю на пароме, гляджу, як акунь,
Паблізу плыве пад празрытай вадой,
А дахамі збоку блішчыць Церабунь[1].
Дамы каляровыя, побач сады,
Згінаюцца дрэвы ад яблыкаў, груш,
Яны адбіваюцца ў люстры вады,
Якое плыве дзесь у цёмную глуш.
За рэчкаю бачу на горцы царкву,
Мяне завялі туды хлопцы на фэст,
Дзе ўбачыў тады першы раз наяву,
Ларкі, дзе жыды прадавалі агрэст.
Навокал царквы гаманлівы народ,
Хадзіў, таргаваўся з жыдамі ў ларках.
Стаяла дзесяткі сялянскіх падвод,
Да рэчкі даходзіў ад іх конскі пах.
Да дзядзькі прыехаў я з бацькам тады,
Два тыдні, не больш, перад самай вайной,
І ў мроях я помню як тут маладым
Я плыў на пароме па рэчцы Лясной.
Як мы ў Матыкалах вячэрняй парой
Чакалі, аж прыйдзе ў Чаромху цягнік,
То ў небе раптоўна нарушыў спакой
Якісь самалёт, загудзеў і дзесь знік.
Заззялі рэфлектары з розных бакоў,
Шукалі яго ў небе слупы святла,
Няўдалым аднак быў тады іхні ўлоў,
Загінуў аб'ект, як у лесе пчала.

[1] Церабунь, па-руску – Терабунь, мясцовая назва – Тэрэбунь, вёска ля Брэста.

# ПОДЫХІ ЗЛА

## ЗЛО

Зло заўсёды ганарыцца сілай,
Мае ўладу моцную ў руках,
Астаўляе па сабе магілы,
Боль і раны, хітрасць павука.
Не расчуляць зла чужыя слёзы,
Цешыцца, як чуе енк наўкол,
Мае зло заўсёды твар цвярозы,
На яго насунуўшы чахол.
Зло заўсёды супраць прабачэння,
Зло – то помста, зло – то фанатызм,
А нянавісць стала яго ценем,
З ім яна – адзіны арганізм.
Зло штодзень мы чуем, бачым часта:
Ашуканства, хцівасць і падман.
Зло стварыла мафіі і касты.
Зло стварыла штык, бізун, наган.
Многа зла ва ўчынках у тыранаў
І ў дзяржаўных злых уладароў,
Як ад дзеяў і загадаў іх заганных
Паплыла калісь людская кроў.
Зло даўно стварыла бітвы, войны,
І паходы прагных крыжакоў
На людзей нявінных і спакойных
Праз дзесятак страчаных вякоў.
Зло цяпер стварае тэрарыстаў
І забойцаў бомбамі дзяцей,
Аферыстаў, злых авантурыстаў.
Многа іх цяпер ёсць між людзей.

## АХВЯРЫ ЗА СВАБОДУ

За яе ў барацьбе людей гінуць мільёны
Ад мячоў і ад куль, ад гармат, ад захопаў.
Пасылаюць салдатаў у бой батальёны
За яе, каб забілі іх дзесьці ў акопах.
За яе і на шыбеніцах паміраюць,
Каруселі памерлых скрыпяць, як знявага,
За жаданне свабоды турмою караюць,
А нядаўна яшчэ забівалі ў ГУЛАГ-ах.
За яе ў крэматорыях гінулі людзі,
І напальмам палілі людзей у В’етнаме,
І за нашу свабоду мы ахвяр не забудзем,
Іх успомнім заўжды ў нашым доме і ў храме.
За яе бічавалі калісь езуіты
І палілі людзей на кастрах, як за здраду.
За яе ваявалі катары, гусіты,
Крыжакі мардавалі ўсіх іх без спагады.
За яе прападалі кітайцы, карэйцы
Ад японскіх салдатаў і самураяў,
А ў Паўднёвай Амерыцы ў джунглях індзейцаў,
Мардавалі з Гішпаніі канкістрадораў злых зграі.
За яе ўсе галіны на дрэве свабоды
Ад ахвяр там павешаных будуць згінацца.
І далей за яе барацьбіты ў народах
Увесь час на зямлі будуць зноў нараджацца.
І далей паўставаць будуць побач пагосты
Для ўсё новых забітых ахвяр за свабоду.
За загінуўшых будзем мы піць часта тосты
І бясконца чакаць між народамі згоды.

## РАБЫ САТРАПАЎ

Рабы баяцца часта волю мець,
Таму і хваляць кожнага сатрапа,
Які змушае іх ад страху млець,
Трымаючы бізун у моцных лапах.
    Глядзяць пакорна, як ля іх тыран
    Суседзяў нішчыць, нават вельмі блізкіх,
    Як у руках трымаючы наган,
    Ён палітычныя праводзіць чысткі.
Не бударажыць іх цэнзуры біч,
Які над імі ён заўжды трымае,
Што нізашто людзей далёка ў дзіч,
Ці ў лагеры, ці ў турмы пасылае.
    Тыран мільёны мае верных слуг,
    Якія сталі ўсе яго рабамі,
    Яны ў няволі жудасны ланцуг
    Закоўваюць народ сваймі рукамі.
Рабы тырана хочуць мець рабоў,
Каб здзеквацца над імі без спагады.
Не непакоіць іх чужая кроў,
Калі пяюць сатрапе серэнады.
    Калі тыран ім не зламаў хрыбет,
    Ім пугай не паспеў яго абцерці,
    Яго партрэты будуць, як букет,
    Насіць заўжды пасля тырана смерці.
Паставяць нават помнік для яго
І будуць славіць на сваіх паходах.
Тыран рабам патрэбны, як кагор,
Каб ап’яняў іх з нейкай асалодай.

## ПРАВЕРКА ВІНЫ

Змяніла бура наша пакаленне,
Забрала пугі з вельмі жорсткіх рук,
З тыранаў здзёрла моц закабалення
І ў павуцінні страшыць іх павук.
Іх слугі часта лепшы маюць голас,
Бо ўзбагацелі ўміг на грабяжы,
Ва ўладах новых рэй вядуць наўкола
І твораць новы вычварны рэжым.
Калісьці ворагі іх, барацьбіты,
Сябрамі сталі новымі цяпер,
Іх бізнэсы супольныя арбіты
Для грабяжу знайшлі і для кар’ер.
Дрыжаць ад сораму, закрыўшы вочы,
Схаваўшыся малыя стукачы,
Другія іх вышукваюць ахвоча,
Стараюцца ім моцна дапячы.
Не раз абвінавачваюць нявінных,
На іх кідаюць пошлую ману
І ядам іх аплёўваюць змяіным,
Каб свет іх безнадзейна праклянуў.
Яны ў судах шукаюць дапамогі,
Яе шукаць там могуць праз гады.
Здароўе страцяць перад іх парогам,
Пакуль знімуць паклёпы з іх суды.
Варожасць толькі сеецца ў народзе,
Нянавісць выбухае, як пажар,
Смяюцца багацеі ў карагодзе.
Між вінаватых не відаць ахвяр.

## КЛЯЙМУЙЦЕ

Кляймуйце крыўды, подласці злачынцаў,
Стварыўшых  боль цярпення іншым людзям.
Хваліце дапамогі дабрачынцаў
І справядлівыя працэсы судзяў.
Кляймуйце жорсткасць, подласці тыранаў,
І тых, хто іх выконвае загады,
Кляймуйце іх усюды несціхана,
Не майце для іх літасці, спагады.
Кляймуйце узурпатараў ілжывай
Улады, быццам бы ім дадзенай ад Бога,
І ўсю ману іх выдумак фальшывых,
Калі гудзяць у храмах, сінагогах.
Кляймуйце ўсіх сатрапаў па іх смерці,
Хай знаюць, што грахі іх не загінуць.
Хаця далі спакойна ім памерці,
Пасля напішуць аб усіх іх вінах.
Кляймуўце злодзеяў і ўсіх бандытаў
І дробных махляроў, і ашуканцаў,
Апосталаў вайны і іх наймітаў
І лагерных забойцаў францысканцаў.
Кляймуйце тэрарыстаў на планеце,
Якія забіваюць без спагады.
Бо гінуць ад іх рук жанчыны, дзеці,
Людзей нявінных цэлыя грамады.
Тады паўстане лепшы лад на свеце,
Злачынцы могуць пабаяцца ганьбы.
І людзі часта засвяткуюць даўгалецце,
Бо іх менш будуць мучыць слёзы жальбы.

## МЕТАМАРФОЗЫ БЯЗДОМНАГА

Хоць і няма ў кішэні грошай,
Яго вясёлая душа
Шукае радасці, раскошы,
Пацехі ў мроях галыша.
    Як ноч навокал кіне цені,
    Бадзяцца хоча між людзей.
    І хоць баляць яго калені,
    Ідзе на горад паглядзець.
Блукае па старых завулках,
Ля прастытутак знойдзе шлях,
Памарыць ён аб свежых булках,
Пачуўшы дзесь з пякарні пах.
    Загляне ў сметнік дзесь за домам.
    Ці там чаго-небудзь няма,
    Як аслабее ён ад стомы,
    Скажа: „А дзе ж мая турма?"
І пойдзе спаць у заканурак,
Там дзе ляжыць яго бярлог,
Там аб мінулым ён панура,
Сабе сам скажа маналог.
    Калісь кватэру меў і працу,
    Ніколі голаду не знаў,
    І з „Салідарнасцю" на пляцы
    Ён з камунізмам ваяваў.
Калі прыйшоў у эйфарыі,
Чаканы ім дзяржаўны лад,
Ён страціў  у яго стыхіі
Працу, кватэру, ўвесь свой клад.

## ЯСЕНОВАЦ

Калі распачнеш выпадкова
Блукаць па харвацкай зямлі,
Наведай хоць раз Ясеновац,
Харвацкі Асвенцім калісь.
Тры лагеры смерці выгнанцаў
Пабачыш, дзе гурмы людзей
Загінулі з рук францысканцаў
І тысячы сербскіх дзяцей.
Спаборнічалі там францысканцы,
Хто большы задасць людзям здзек,
Чый горлаў больш выража ў танцы
Закруглены нож, сербасек.
Спаборніцтва выйграў ксёндз Брзіца,
Нажом у адзін толькі дзень
Абсек ён галовы, як львіца,
Для тысячы трыста людзей[1].
Там гінулі сербы, габрэі,
Цыгане. Сто тысяч ахфяр.
Служыцелі злога кашчэя,
Для ўсіх іх стварылі кашмар.
Для сербаў знайшлі гільяціну
Харвацкія каты, хлюсты,
А яры іх вораг Стэпінач[2]
У Рыме ўжо будзе святым.
Найгоршы злачынец Павеліч[3]
У Рыме ратунак знайшоў.
Хавалі яго, як умелі,
Астатні ў Мадрыце меў схоў.

---

[1] Дакладна 28 жніўня 1942 г. францысканскі ксёндз Брзіца абрэзаў галовы за адзін дзень 1360 сербам, а 7 лютага 1942 г. у час ракавацкай разні забілі 1749 сербаў і 551 сербскіх дзяцей.

[2] А. Стэпінач (1898-1960) – архіепіскап Заграба (1937-1960), вайсковы вікарый у час усташоўскага рэжыму (1942-1945), яры вораг сербаў і праваслаўя, пагаджаўся з гвалтамі на сербах, цыганах і габрэях усташоўскага рэжыму. Пасля вайны А. Стэпінач 6 год прасядзеў у югаслаўскай турме, у 1952 г. папа Пій XII даў яму кардынальскае званне, а ў 1998 г. папа Ян Павел II яго беатыфікаваў.

[3] А. Павеліч (1889-1959) –дыктатар усташоўскага рэжыму ў Харватыі, васал Гітлера (1941-1945), Ватыкан памог яму ўцячы з пачатку

ў Аргенціну, а пасля яго ранення ў Гішпанію пад крыло дыктатара генералісімуса Ф. Франка (1892-1975).



1955 г. Аўтар і жонка з сынам і хросныя сына.

## ВОЎК АСІМІЛЯЦЫІ

Наш воўк асіміляцыі
Хапае нам дзяцей,
Бярэ для адукацыі
Нам часта ад грудзей.
    Мы самі з дапамогаю
    Яму ў той час ідзем,
    Як з вёскі жыць з трывогаю
    У горад пападзем.
І побач незнаёмыя
Навокал будуць жыць,
І словы невядомыя
Ад іх пачнем зубрыць.
    Дзяцей нам будзе сорамна
    Вучыць там родных слоў,
    Воўк будзе задаволены
    Што мае лёгкі ўлоў.
Бацькі чужою моваю
Гавораць да дзяцей,
А з роднаю вясковаю
Саромяцца людзей.
    Такіх дзяцей канвеерам
    Воўк хутка забярэ,
    Зацягне ён іх веерам
    Не ў наша кабарэ.
Іх нашымі чужынцамі
Ён зробіць праз гады
І могуць стаць злачынцамі
Для ўсіх нас назаўжды.

## ПАЛІТЫКІ НА П’ЕДЭСТАЛАХ

Яны ўзышлі на п’едэсталы
Баяцца, каб не спасці з іх,
Глядзяць згары на нас нядбала,
Як на людзей зусім дурных.
Здаецца ім, што ўсе іх словы
Заўжды захопяць моцна нас,
Што будуць бачыць нас гатовых
За іх аддаць жыццё падчас.
Здаецца ім, што мы паверым
У іх штодзённую ману,
Паможам ім у іх кар’еры,
Ім грошы аддамо ў казну.
Іх чуем лаянкі і джалы,
І як аплёўваюць сябе,
Вайну глядзім на п’едэсталах,
Ахвяры відны ў барацьбе.
Як падаюць яны з іх з шумам,
Каб узысці заўзята зноў,
І як танцуюць перад тлумам,
Каб не прынёс ім кайданоў.
Хоць мы не верым у іх словы,
У іх бязглуздзіцу, брахню,
Не хочам бачыць іх галовы
Пад п’едэсталамі ў агню.
Пасля ўзыдуць на п’едэсталы
Падобных тысячы галоў,
Між іх не знойдзем ідэалаў,
Будуць хлусіць таксама зноў.

## СВЯТА ПЕРАМОГІ

Тры дні святкавалі яны перамогу,
Пасвараныя з-за яе між сабой,
Узносілі гімны пахвальныя Богу,
Што ўладу ім даў і з казны добры ўдой.
Гасцей запрасілі на свята з Еўропы,
Бо грошай у крызісе ім не шкада,
Баяліся ўспомніць свае недахопы,
Як мучыць людзей беспрацоўе, бяда.
Як вокал блукаюць грамады бяздомных,
Як гінуць галодныя часта ў мароз.
Цяпер ашуканцам рабочых наёмных,
Гучыць, задыхаецца апафеоз.
Яны памаглі ім дарвацца да ўлады,
Каб хабар узяць за чужое дабро,
Таму ім так гучна пяюць серэнады,
Ім вешаюць золата ці серабро.
Стварыць нам Японію тут абяцалі,
Пасля прадалі прадпрыемствы чужым,
А тыя закрылі іх дзвермі са сталі,
І новы ў гасцінцу далі нам рэжым.
Цяпер пераможцы зноў сварацца многа,
Што чуецца ў сойме іх лаянка, крык.
Святкуюць асобна яны перамогу
І ў двух гарадах чуць іх радасны рык.
Пішчаць дзесь пратэсты наёмных рабочых,
Аднак пераможцы не слухаюць іх.
Яны перасталі звяртаць на іх вочы,
Хацелі б, каб згінуў аб іх нават слых.

## МАНІЯ БАГАЦЦЯ

Манія багацця вычварным азартам
Захапляе часта ўсё жыццё людзей,
Крочаць да яго ў трызненні, буйна, ўпарта,
Не баяцца ўлады, святароў, судзей.
Трацяць па дарозе ўсё сваё сумленне,
Каб дабіццца мэты гонар аддаюць,
Хабар, ашуканства ім дае натхненне,
Каб ажыццяўляць задуму ўсю сваю.
Манія дагляду за сваім багаццем,
Каб яно не ўпала да варожых рук,
Забірае час ім, мучыць, як пракляцце,
Кажа ў павуціне страшыць, як павук.
Мусяць мець ахову, каб зграі бандытаў
Не маглі ўзяць выкуп за кагось з сям'і,
Ці ад куль не згінуць ворагаў наймітаў,
Ад падкінутай дзесь бомбы ці змяі.
Маніі багатых з хцівасцю бязмернай
Пагражае часта лагер і турма,
Страцяць там здароўе хутка неймаверна,
Аддадуць багацце для казны дарма.
Забірае смерць і бедных, і багатых,
Спадчына багатых кончыцца ў судах,
За яе спрачацца будуць адвакаты
І варожых спадкаемцаў чарада.
Часта спадчыну бяруць чужыя дзеці,
Бо ад жонак ён атрымаў не свае...
Кепска беднаму пражыць на нашым свеце,
Ды багацце многа шчасця не дае.

# ПОДЫХІ ПРЫРОДЫ

## ПЕРАПЁЛКІ

Над зялёным скошаным нядаўна лугам
Перапёлка закрычала: „Спаць пара!”
Заскрыпеў драч, быццам быў яе ён другам
З недалёкай цемры голасна: „Ура!”
Пачалі пераклікацца між сабою
І іх рэха адбіваў далёкі лес.
І другія перапёлкі за ракою
Зазвінелі гучным тэмбрам, як аркестр.
Салаўі спяваць даўно ўжо перасталі
І зязюляў голас з лесу ўжо замоўк,
А вось ноччу перапёлкі заспявалі,
Зазвінелі ўсе яны званкамі слоў.
Драч заціх, спявалі толькі перапёлкі,
Іх аркестр іграў на небе дзесь з-пад хмар,
З-пад якіх высока месяц, як вясёлка,
Заблішчаў і загарэўся, як пажар.
Ён напэўна захапіўся іхняй песняй
І пабачыць ён хацеў іх з вышыні.
Ён стаў хмары прабіваць там, як лёд пешняй,
Роям маланак такіх, як карані.
Бегалі яны зігзагамі па хмарах,
І хацелі адагнаць іх аж за лес,
Ды яны, як вельмі грозная пачвара,
Бараніліся ўвесь час, як Геркулес.
І пачуліся з-пад лесу гукі грому,
Хмара месяцу закрыла цэлы твар,
І заціхлі перапёлкі, як ад стомы,
З перапуду пахаваліся ў гушчар.

## СТАРЫЯ ЦЯРПЕННІ

Мы забываем нашыя цярпенні,
Якія лёс на нас каліcь наслаў,
Яны мільгаюць часам, быццам цені
Ад нашага жыццёвага вясла.
Мы часта ўспомнім іх, як злую казку,
Уздрыгнем часам і пачуем боль,
З яе сыдзем, так як з дарогі гразкай,
Каб не нацерці на душы мазоль.
Тыя цярпенні мы не вернем сёння,
Яны мінулі, як прайшла вайна.
Для іх цяпер нішто не будзе роўняй,
І параўнанне іх – адна мана.
Лепш цешыцца тым, што стаіць навокал,
Тым што прыйшла пасля зімы вясна,
Хай радуе цяпер жывое вока
За лугам лесу новая сцяна.
На лузе з кветкамі пачуем песню
Дзяўчыны ці на небе салаўя.
Забудзем гора нават напрадвесні,
Калі бліснe блакіту кісяя.
Нішто нам не прыпомніць дзён цярпення,
Усё змянілася за гэты час,
Цяпер жыве другое пакаленне,
Другіх людзей сустрэнем мы анфас.
Ды толькі назвы імён у знаёмых
Не зменяцца, калі спаткаем іх,
Ім аб цярпеннях нашых, нам вядомых,
Не будзе сэнсу ўспамінаць услых.

## ВЕНЕРА

Для грэкаў калісьці была Афрадыта
Багіняй нябёсаў, палёў, маладосці,
Пасля зноў кахання, жывой прыгажосці,
Багіняю мора, матросаў, сейбітаў.
Рымляне яе міф ад грэкаў забралі,
Багіні Венеры яго дапісалі.
І стала Венера прамацерай роду
І Юлія Цэзара, і Актавіяна,
І хутка стварылі з багіні каханай,
Прамацер для рымскай краіны, народу.
І ёй будавалі чароўныя храмы,
Скульптуры яе запаўнялі ўсе крамы.
Яшчэ яе статуі ў нейкіх музеях
Спакойна да нашых часоў датрывалі,
Прыгожасць у мармуры ўсю захавалі.
Яны ўспамінаюць аб старых падзеях.
На многіх палотнах пабачым Венеру
З фігурай прыгожай, з усмешкай бадзёрай.
Назвалі Венерай суседку планету,
Найбольшую з зорак, між намі, а сонцам.
Бялее нарцысам ці ззяе чырвонцам
На небе бясхмарным зімою і летам.
І вечарам свеціць раскошна і ранкам
І людзі яе ахрысцілі заранкай.
Даўно да яе даляцелі ракеты,
Якія Венерамі ўсіх іх назвалі,
І з іх апараты ў балонах са сталі,
Аселі ў гарачую пашчу планеты.
Кароткія з зяпы прыслалі сігналы,
Якія яна мае грозныя джалы.

## ПЕРЛАМУТРАВЫ ДЗЕНЬ

Пасля перамучанай ночы,
Чароўны з-пад неба прамень
Адкрыў праз акно мае вочы,
Мне даў перламутравы дзень.
        Глядзеў на мяне, як вясёлка,
        Ля сонца бліскаў арэол.
        І ясень, і вішня, і ёлка,
        Як маціца ззялі наўкол.
А колерам жемчугу сцены
Іскрыліся блізкіх дамоў,
А птушкі, як кветкі марэны
Ляталі над луга трумо.
        І луг залаціўся ад кветак,
        Ад птахаў, малых матылькоў,
        Як рой перламутравых сетак,
        Мільгаў на ім з розных бакоў.
І выцягнуў сілаю з хаты
Мяне азараючы дзень,
Ён быццам з брылянтаў крылатых,
Стварыў прамяністы струмень,
        Які акружыў мяне ўсюды,
        І я, як маёліка, ў ім,
        Блішчэў і наўкол бачыў цуды,
        Меў дзіўнай энергіі ўздым.
Я, як ювелір, меў пацеху
З вясёлкавых бляскаў наўкол,
З нябеснага гучнага рэха,
Шумеўшага, быццам арол.

## СЭНС ЖЫЦЦЯ

Сэнс і значэнне нашага жыцця
Адчуем мы, калі яно заўжды
Карысць прыносіць будзе для быцця
Другіх людзей старых ці маладых.
        Калі нікому крыўды і бяды,
        Не зробім дзесь наўмысна для людзей,
        Калі паможам чэсным сапраўды,
        Не звяжамся з злачынцамі нідзе.
Як будзем людзям будаваць дамы,
Ліквідаваць бандытаў і зладзюг,
Паэм ці іншых кніг пісаць тамы,
І працаваць з запалам, як біцюг.
        Жыве без сэнсу злодзей ці бандыт,
        Не мае ён пашаны, толькі жах,
        Без сэнсу пражывае сібарыт,
        Міне, як цень, яго жыццёвы шлях.
Здабудзе славу горкую тыран,
Праклёны будуць ліцца праз гады,
Яго жыццё мільгне, як ураган,
Які разбурыў вёскі, гарады.
        А палкаводца кожнага паход
        Удзячнасць з сэнсам будзе мець заўжды,
        Як выратуе родны свой народ
        Ад ворага набегу, ад бяды.
Калі ж ідзе ён, каб закабаліць
Другі народ ці племя ці людзей,
Захопнікам ён стане іх зямлі,
І ворагам, як грозны ліхадзей.

## ЗАХАПЛЯЙСЯ

Забыўшы цярпенні, якія пражыў
Калісь ты даўно ці нядаўна яшчэ,
Забыўшы ўсё зло, што ты іншым стварыў
У час бурных дзён ці бяссонных начэй,
Выходзіш на снежнае поле і луг,
І бачыш, што ў сонцы ўсё ззяе наўкруг.
Здаецца табе, што папаў ты ў сам рай,
Брыльянты навокал ляжаць на зямлі,
Смарагдам здалёк усміхаецца гай,
Вясёлкай іскрацца лугі і палі.
А з белага пуху раскіданых дрэў
Ад ветру анёльскі расходзіцца спеў.
А рэчка пад лесам блішчыць, быццам вуж,
У лусцы яе адбіваецца лес,
І сотні пялёсткаў квітнеючых руж
Адпаўшых ад хмарак з бліскучых нябёс.
Гірляндаю колераў луска яе
Так ззяе, што снег навакол растае.
За рэчкай пад лесам на лыжах плыве
Прыгожая пара: дзяўчына, хлапец,
А шапка-букет на яе галаве
У промнях бліскае, як шлюбны вянец.
Упалі наўмысна на лыжах у снег,
Відаць пацалункі і звонкі чуць смех.
Забудзь тут на снезе турботы свае,
І цешся ўсім тым, што тут бачыш наўкол,
І захапляйся ўсім тым, што твае,
Як сонца з праменняў тут тчэ арэол.
І цешся прыродай, і цешся жыццём,
Чароўнай прыгожасці май пачуццё.

## НАЧНАЯ МУЗЫКА

Падносяць ноччу дрэвы крылы
І вецер грае ў пёрах іх.
Прыемнай музыкі гук мілы
Раскошай нам ласкоча слых.
        Лістота б'е апладысменты.
        Драўляны дах, як ксілафон,
        У такт звініць з тэмпераментам
        І чуць далёкі пераразвон.
Начная музыка навокал,
Гучыць, як духавы аркестр,
Ёй памагае лямпы цокаль,
Сагнуты для яе падвес.
        І стук дажджу па шкляных шыбах
        І шорах шэрага пяску
        Пад хатай на ўзараных скібах,
        І жэрдкі скрып дзесь у кутку.
Усё сімфонію стварае,
Якую чуеш толькі тут.
Начная музыка іграе,
Яе пазнаеш атрыбут.
        Яе паслухай, як змяркацца,
        Пачне паволі светлы дзень,
        Ты станеш ёю захапляцца,
        Калі ад сонца згіне цень.
Як будуць птушкі ў сваіх гнёздах
І церусіць пачне дождж з хмар,
Вада паявіцца ў барознах,
І будзе мокры тратуар.

## ЗАХАПЛЕННЕ САБОЙ

Яна стаіць перад трумо,
Глядзіць і цешыцца сабою,
Прыемна ёй стаяць самой
І гладзіць валасы рукою.
  Як кветка ззяе яе твар
  У ім чуць пругкасць, свежасць плоду,
  А зрэнкі свецяць, як ліхтар,
  Як сонца ў светлую пагоду.
То, як дыяменты расы,
Зіхцяць яны ў трумо навокал.
І цешыцца з сваёй красы
Яна маргнуўшы правым вокам.
  Пупышкі вострыя грудзей
  Выказвалі яе юрлівасць
  І мрою радасных надзей,
  Што ўсё закончыцца шчасліва.
Фігура стройная яе,
Як статуя ў трумо бялела,
Алмазнае яе калье
Святлом іграла, як капэла.
  Калі насупіла брыво,
  То ў зрэнцы праляцела хмара,
  І маланкі агонь жывы,
  Прабег зігзагам ёй па твары.
Ды хутка ён зусім загас
І радасцю заззялі вочы.
Яна глядзела доўгі час
На пекны вобраз свой жаночы.

## ПОШУК ВЕТРАМ ДАЛЯЧЫНЬ

Ветру шум шукае далячынь,
Дзе была б свабодная прастора,
Дзе нябачнага паветру плынь
Чулася б стыхіяю бадзёрай.
Ён між вузкіх вулак робіць крык,
Заглядае гучна ў сутарэнне,
Коле, нішчыць, як сталёвы штык,
Напатканае вакол стварэнне.
Скочыць на асфальт ён і трасе
Змучаныя колы ад машыны,
А на лузе мыецца ў расе
І зрывае ў лесе з дрэў галіны.
Як на вёску дзіка набяжыць
То з дамоў, з хлявоў скідае дахі,
Вёска ўся грукоча і дрыжыць,
Ён нясе ўсім небяспеку, жахі.
Цешыцца, калі там страх узнік,
Плач дзяцей – звычайнае здарэнне.
Любіць ён жанчын жалобны крык,
Створанае ім наўкол знішчэнне.
Як ускочыць на прастор палёў,
Ён пачуе ў мускулах свабоду,
Можа там лятаць, як мышалоў,
Нават у дажджлівую пагоду.
На клавішах злых сваёй душы,
Можа ён іграць на ўсю прастору,
Можа ён раллю ўсю церушыць,
Падымаць пясок, як хвалі ў моры.

## ПАКЛОНЫ

Калі сустрэну родныя палі
Лясы, лугі, знаёмыя мясціны,
Паклоны б'ю ім нізка да зямлі
І з імі з кожнай цешуся хвіліны.
        Тады ўспамінаў матыльковы рой
        Уецца радугаю нада мною,
        І чую ў сэрцы радасны настрой,
        І льецца мне ў душу бальзам спакою.
Гляджу на луг, дзе бегаў басанож
Калісь з дзяцьмі я па траве зялёнай,
І дзе змачыў не раз нас цёплы дождж,
Дзе з хмар блішчэла сонца, як карона.
        А там вось лес, дзе я збіраў грыбы,
        Ці ягады з дзяўчынамі, гурбою,
        Шкада, што ўжо няма тут той вярбы,
        Дзе ў карты мы ігралі між сабою.
Хацеў бы пакланіцца тым садам,
Дзе  бачыў я і яблыні і грушы,
Ды іх няма, а вельмі іх шкада,
Загінулі ўсе, быццам бы ад сушы.
        Я школе пакланіцца бы хацеў,
        Ды згінула пустая ад пажару,
        Не відна ў вёсцы ўжо зусім дзяцей,
        Амаль не бачу маладога твару.
Аднак да вёскі шлю я свой паклон,
Дамоў знаёмых многа ў ёй я бачу.
Смяюцца шыбы чыстыя з акон,
Я брэх сабак пачуў яшчэ ў прыдачу.

## ВОБЛАКІ

Гляджу на воблакаў жывую кісяю,
Якая ззяе нада мной янтарным бляскам.
І прыгажосць усім паказвае сваю,
Якую можна толькі выдумаць у казках.
Плыве паціху, як вясёлкавы струмень,
Бліскучай стужкаю па небе цэлы дзень.
Я ёй зайздрошчу, што ў яе няма граніц,
Што пашпарта ў яе ніхто не запытае,
Што ноччу бачыць два сузор'і Мядзведзіц
І цэлы дзень над ёю сонца ярка ззяе,
А ўнізе сочыць акіяны і лясы
І чуе летам розных птушак галасы.
Гляджу на іх і забываю горкі лёс,
Які калісь мяне сустрэў на каляінах.
І радуе мяне між іх блакіт нябёс,
І хмаркі чорныя, засеўшыя ў шчылінах.
І горкіх успамінаў гіне ў сэрцы боль,
Бо знікнуў вырасшы калісь ад іх мазоль.
Хацеў бы я высока з імі паляцець
З-за воблакаў глядзець на ўсходнія краіны,
Сафію ўбачыць і Блакітную мячэць,
А потым у Іране старажытныя руіны.
Як воблакі, свабоду чуць вакол сябе,
Па небе разам з імі плыць, як карабель.
Аднак магу цяпер іх толькі папрасіць,
Каб мой паклон перадалі ўсім на Падляшшы,
Каб з кісяі спусцілі ім жывую ніць
З напіткам радасці жыцця ў чароўнай чашы,
Каб маладосць усе пачулі ад яго,
Не забывалі роднай мовы і сцягоў.

## КОЛЕРЫ СВЕТУ Ў МРОЯХ

Наш свет мы ўсе малюем колерамі мрояў.
Бо хочам, каб ён быў прыгожы і вясёлы.
Не любім, каб ён страшыў нас шалёнай зброяй,
Каб выбухі снарадаў чулі мы наўкола.
Наш свет мы ўсе малюем колерамі думак,
Мы хочам, каб ён быў для нас заўжды прыязны,
Не любім мы глядзець з патронамі падсумак,
Бо можа імі страшыць нехта неразважны.
Нармальны чалавек не церпіць зла і жаху,
Яго пужае лютасць, помста і каварства,
Ад ворагаў не любіць уцякаць са страху,
Ад подласці заўсёды шукае ён лякарства.
Злачынцы свет малююць колерам крывавым,
Агонь і плач дае ім радасць, асалоду,
Шукаюць бітваў, войнаў подзвігаў для славы,
Другіх людзей пакрыўдзіць ці зрабіць ім шкоду.
Пустэльнікі малююць свет святлом пустыні,
Ці колерамі цемры ў адзінокіх келлях,
Людзей яны не любяць, нават колер сіні
Ніколі не дае ім радасці, вяселля.
Малююць маракі свет колерамі хваляў
Якія бачаць толькі, як плывуць па моры,
Дзяўчыны свет малююць колерам караляў,
Якія, як вясёлкі, ззяюць на прасторы.
А селянін малюе колерамі нівы,
Якая вырастае летам на загонах,
Пры добрым ураджаі чуецца шчаслівым.
Малюе ўсё спачатку колерам зялёным.

## ЦІ АПАКАЛІПСІС?

Затраслася зямля зноў на свеце,
У Еўропу прыйшоў землятрус.
Ён блукае па нашай планеце
І ахвяры складае на стус.
        Быў яшчэ ён нядаўна ў Кітаі
        І ў Італію сёння, як змей,
        Ён усунуўся ноччу ў адчаі,
        Каб засыпаць пад друзам людзей.
Ён разбурыў там многія вёскі,
У Аквіле ён знішчыў дамы.
Нехта верыць, што гэта гнеў боскі,
За грахі Бог паслаў там грамы.
        Апакаліпсіс гнойнаю ранай
        Нам паказвае смерці іклы,
        Страшны Суд па дарозе нязнанай
        Падыйшоў да нас грозны і злы.
А чаму там загінулі дзеці?
Ці было ў іх так многа грахоў?
А чаму гінуць людзі ў мячэцях
З рук суніцкіх малых пастухоў?
        Землятрусы праз тысячагоддзі
        Забівалі нявінных людзей
        І яны нараджалі ў народзе,
        Злых прарокаў у горкай бядзе.
Прадвяшчалі прарокі заўсёды,
Страшны Суд для людзей на зямлі,
Хоць навокал цвілі агароды,
І далей людзі побач жылі.

## У АГАРОДЗЕ

Я выйду за хату і бачу за плотам,
Як летам прыгожа цвіце агарод,
Сланечнік у сонцы блішчыць пазалотай,
Вітае з усмешкай салодкай, як мёд.
          А колеры кветак тут радугай ззяюць,
          Да нектару клічуць раі вос і пчол.
          Між імі тут Ева была б як у раю,
          Адам з захапленнем глядзеў бы наўкол.
Цяпер ад цыбулі не льюцца мне слёзы
Яна зелянее, а побач часнок
Глядзіць на гарбуз: ці ляжыць ён цвярозы?
Ці побач цыбулі жывы агурок?
          Моркаўка без сонца ў зямлі пажаўцела,
          І выйшла наверх, як бліскучы янтар,
          Трымае націнне зялёнае смела,
          Паказвае мне свой чароўны загар.
Лісцё лапуха агуркі цёмным ценем,
Прыкрылі, а побач вялікі бурак
Злуе на яго і чырвоным праменем,
Пужае яго, каб загінуў лайдак.
          Капуста прысела ў радках ад знямогі,
          Зайздросна абнюхвае радасны кроп,
          Глядзіць, як гайдаецца мак даўганогі,
          Стук макавак чуе, як конскі галоп.
А бліска расце грубаскурая бручка,
І горкая рэдзька і бульбы радок,
Маліны, суніцы, шыпшына ў калючках.
За імі плот з форткай, за плотам садок.

## ПОЗНЯЙ ВОСЕННЮ

Позняй восенню густы халодны дождж
Стукае працягла ў шыбы і па сценах,
Рэжа мураву ля дома, быццам нож,
З даху ён уніз цячэ, як кроў па венах.
І струменьчыкі бягуць у ручайкі
Па каменьчыках абмытых з тлустай мазі,
Абмінаючы ўсе грывы асакі,
Пападуць у цёмны роў, дзе поўна гразі.
За акном гнілое лісце скача на траве,
Ад удараў кропляў падаючых з неба.
Многа іх у роў з вадою паплыве
І змяшаецца там хутка з бруднай глебай.
А калісь яны зялёнымі былі,
Упрыгожвалі вясной і летам дрэвы,
Красаваліся на сонцы і жылі
І ў лістоце іх гучалі птушак спевы.
Восень моўчкі адабрала ім жыццё,
У зямлю іх аддала ўсіх без спагады.
Лёс падобны нас чакае, як лісцё,
Смерць, як восень, заспявае серэнады.
За акном яшчэ я чую едзе воз,
Нехта ў дождж кудысь паехаў у змрок ночы,
На чыгунцы загудзеў электравоз,
Вецер дзіўна плача голасам сірочым.
Згаслі ў хатах і на вуліцах агні,
А дождж стукае па шыбах, як шалёны.
Абвяшчаюць нам зімовыя ўжо дні
Карканнем на дрэвах шэрыя вароны.

## СУСВЕТ

Заўсёды будзе нам загадкай наш сусвет
З яго мільярдамі галактык у прасторы,
З мільярдамі ў галактыках і зорак і планет,
З іх вечным рухам, безупынным і бадзёрым.
Над намі зоркі ззяюць, як з агню шары,
І мае кожная ў галактыцы арбіту,
Навокал зорак кружацца, як камары,
Планеты, і ляцяць за імі, быццам світы.
Між імі рухаюцца, быццам бы ўюны.
З хвастамі, з дзіўнымі  галоўкамі каметы,
Яны з'яўляюцца, як злыя вястуны,
Прыносяць людзям страх няшчасця дзесь з сусвету.
Глядзім не раз. як з неба падаюць уніз,
Як зорак яркія раі, метэарыты,
Як кожны з іх рысуе казачны эскіз,
Якія разам ззяюць, як александрыты.
Сусвет існуе ўжо мільярды нашых год,
Пабольшваецца ён, як бурбалачка з мыла,
І кожная галактыка, як параход,
Плыве ў сваім напрамку з невядомай сілай.
Галактыка, дзе мы жывём, наш Млечны Шлях,
Ад іншых адплывае дыскам у прасторы,
Куды плывем не чуем нават ноччу ў снах,
Плывём, як лодкаю ў бязмежным сінім моры.
Аднак сусветаў многа ёсць такіх, як наш,
Яны плывуць як бурбалкі ў мультысусвеце,
Не ведаем ці ў тых сусветах ёсць інакш,
Ці ходзяць дзесь жывыя людзі на планеце.

## ВАЛОШКІ

Між жыта калосся на ззяючым полі
Смяюцца да сонца блакітам валошкі,
Чароўныя кветкі ва ўсім наваколлі,
Маргаюць і ззяюць, як сінія брошкі.
Навокал вусатыя ўсе каласы
Зайзросцяць валошкам чароўнай красы.
    Ад ветру расходзіцца пошум іх песні,
    Якая ляціць па загонах далёка,
    Аб тым, як раслі тут яны напрадвесні,
    Як кожная сталася тут сінявокай.
    Як сцёблы ад ветру ўсіх іх берaглі,
    Як вільгаць цягнулі глыбока з зямлі.
Гучыць над валошкамі голас пчаліны,
Нектар забіраюць, спяваюць куплеты.
Тут часта на поле прыходзяць дзяўчыны
І робяць з валошак вянкі і букеты,
Таксама іх любяць вясной матылькі,
А людзі іх часта завуць: васількі.
    Збіраюць іх людзі таксама на зёлкі,
    З іх робяць сабе вельмі добрыя лекі.
    І гінуць яны ў палявыя праполкі,
    Тады адчуваюць смяротныя здзекі.
    Без вільгаці вянуць на полі адны,
    Ці мучаць іх зубы ліхой бараны.
А ў жніўні іх рэжуць сярпы, або косы,
Малоцяць камбайны з жытнёвай саломай,
Іржышча іх мелюць камбайнаў калёсы,
Іх кветкі кідаюць у сметнік пад домам.
Аднак не загіне прыгожы іх род,
Пабачым яго на наступны ўжо год.

## ВЯЧЭРНІ ЧАС

На мошасце неба заззялі ўжо зоркі,
Мільгаюць, як свечкі, ў бясхмарным бяздонні,
Як жар з папярос з тытуню ці з махоркі,
Як бляскі ад кветак на возернай тоні.
Здаецца, што нейкія падаюць з неба,
Ляцяць і палаюць, як светлыя кулі,
І гінуць над полем не ўпаўшы на глебу,
Зямля не глыне ад іх нават пілюлі.
І месяц на ўсходзе бліснуў, як кадзіла,
Ад дрэў і кустоў паказаліся цені,
Кадзіла святло неба ў рызу змяніла.
І вабяць на ёй залатыя каменні.
Вышэй падымаецца месяц між зорак,
Гарыць, як ліхтар, над дарогай з прысадам,
І добра ўжо відна пад лесам узгорак
І хутар пры ім з агародам і садам.
Бярозавы лес забялеў блізка ўзгорка.
І цені яго б'юць у бляску паклоны,
Да крыжа, дзе свеціць лампада, як зорка,
І побач стаяць дзве малыя іконы.
Паставілі крыж і іконы з лампадай,
Каб Бог ратаваў тут людзей ад засухі,
Каб меў Ён заўжды да іх літасць, спагаду,
Ад іх адганяў цёмнай ноччу злых духаў.
Блішчыць над ім неба царкоўнаю рызай
І промнямі яркімі месяц шугае,
Іх зоркі чаруюць, як кветкі нарцызаў,
А вецер вясёлую песню спявае.

## КРОКУСЫ

Снегу няма ўжо даўно ў агародах,
Рэдка цяпер ён прыходзіць зімой,
Страшыла толькі нас ветрам пагода,
Вецер прыносіў да насградабой.
        Белыя сталі ўжо вішні, чарэшні,
        Кветкі сняжынкамі ззяюць удзень,
        Вецер у садзе спявае ім песні,
        Гойдае збоку з галінак пляцень
Раптам гляджу, а паблізу за садам,
У крокусах цэлы цвіце агарод.
Нават не знішчыў іх дождж разам з градам.
Колеры дзіўныя цешаць народ.
        Цёмна-пурпурныя колеры кветак
        Пры агароджы вітаюць людзей,
        Побач блакітны, як неба, палетак
        Вабіць, як казачны ў сне чарадзей.
І  фіялетамі радуюць кветкі,
Сярэбрана-белыя быццам тытан,
Жоўтыя, як залатыя балеткі.
Назву другую ён мае – шафран.
        Кружацца роямі пчолы і осы,
        Любяць, дзе кветкі, блішчаць, як янтар,
        Розныя робяць над імі дзівосы,
        Хочуць з іх высcаць салодкі нектар.
З рыльцаў іх людзі тут робяць прыправы,
Мелючы ў дробны, як пыл, парашок,
Ён дадаецца да смаку да стравы,
Быццам часнок ці бабковы лісток.


1959 г.  Пястуў ля Варшавы. Аўтар з дачкою

# РЭФЛЕКСІІ

## ПАКУЛЬ...

Пакуль не засыпле пясок на пагосце
З труною схаванае цела маё,
Я буду пісаць аб гадах маладосці,
Якія прайшоў я ў вандроўцы сваёй.
Я буду пісаць аб крывавых падзеях,
Якія тварылі сатрапы калісь,
Аб войнах малых і старых эпапеях,
Якія нясліі смерць і жах на зямлі.
Пішу аб улады, каварных цянётах,
Якія хапаюць нявінных людзей,
Бічую паўстаўшыя ў свеце дурноты,
Якія агіткай сычаць, быццм змей.
Хвашчу біч насілля, тварцоў розных войнаў,
Ад іх паўстае тэрарызм, помсты жах,
Хвалю там дзе людзі працуюць спакойна,
Калі беспрацоўе не муціць іх шлях.
Пішу аб прыродзе, аб прыгажосці,
Аб кветках чароўных, аб колерах руж,
Пішу аб каханні, як людзі без злосці
Спяваюць і цягнуць сваёй працы гуж.
Пісаў я аб ранніх падзеях народа,
З якога мажліва выходзіць мой род,
Аб слаўнай Рагнедзе дачцы Рагвалода,
Як згінуў у Полацку князь Рагвалод.
Пішу, як магу і найлепш, як умею,
Хоць можа не ўсім да спадобы мой верш.
І нават не веру, не маю надзеі,
Што будзе злачынстваў ад вершаў тых менш.

## ГЛЯДЗІМ З НАДЗЕЯЙ

Глядзім на захад і на ўсход,
Глядзім на лес, на цемру хмар,
Глядзім на сад, на агарод,
Ці ўбачым дзесь свабоды твар.
        І клічам голасна праз змрок,
        Што ўжо чакаем доўгі час
        На звон яе, на ціхі крок,
        Крычым: „Хутчэй прыйдзі да нас!”
Цябе ўсе клічам, як рабы,
Якіх закабаліў тыран,
Баімся, стаўшы на дыбы,
Пхнуць з сілай на яго таран.
        Баімся знішчыць слуг яго,
        Якія кожны з бізуном,
        Стаяць паблізу нас кругом
        І страшаць нас усіх даўно.
Не толькі страшаць, часта б’юць,
Закоўваюць у кайданы
І гуртам у турму вядуць
Людзей спакойных без віны.
        Тут з нас чакае не адзін,
        Калі свабоды прыйдзе час,
        І ўсе з надзеяю глядзім,
        Што нам яе заззяе бляск.
Хоць знаем, што за ўсе гады,
Нас згіне многа ў барацьбе,
Ды да яе крычым заўжды:
„Прыйдзі, выглядваем цябе!”.

## КУЮ

Выкідваю з грудзей бясформенную масу
Слоў, дзе бываюць неахайныя алмазы
І на кавадле іх кую на радасць часу,
Каб выкаваць прыгодныя для верша сказы.
Шукаю слоў жывых як у пяску брыльянтаў,
Хоць, як іх не знайду, не будзе катастрофы,
Счапляю сказы ўсе да розных варыянтаў,
Як ланцугі з іх паўстаюць да верша строфы.
Хоць б’ю ў іх молатам адважна і бадзёра,
Не паддаюцца хутка словы сіле ўдара,
Са строф ад націску змяняюць звенні скора,
Злучаюцца ў неадпаведныя ім пары.
Збягаюцца ў свавольстве часта ямб з харэям
І ўскаквае ў страфу анапест без дазволу.
І молат полюсы змяняе ў батарэі,
І ломіць ён страфу, як лёд пад ледаколам.
І паламаную страфу кідае ў сметнік,
Шукае новых слоў, як у пяску алмазаў,
Каб выбраць пасадзіць, як з пекных кветак летнік,
І строфы новыя скаваць са слоў і сказаў.
Акцэнт ён можа зблытаць дзесь у нейкім слове
І загучыць у вершы сказ неадпаведна,
А цяжка знаць акцэнты ў беларускай мове,
У словах ён змяняецца зусім бясследна.
Таму мой молат мае вельмі многа працы,
Куе і часам можа ён зрабіць памылкі.
І голасна шуміць ён у маім палацы,
І відна як ляцяць наўкол яго апілкі.

## СВЯТА СВАЙГО ПАРАЖЭННЯ

Шум сёння вялікі, святочны ў нас дзень,
Святкуем былое свае паражэнне,
Якое прыйшло нечакана, як цень,
І нам прынясло кайданы зневажэння.
Няволю народу яно прынясло,
Зусім існаваць перастала дзяржава,
З віны нашых продкаў, якія сцяблом
Хацелі забіць, ці настрашыць удава.
Калі б пачакалі яны дзесяць год,
Удаў аслабеў бы ад бур, ад знямогі,
Дзяржава б далей існавала, народ
Наўкол мог шукаць для сябе дапамогі.
Напышлівасць продкаў адны кайданы.
Народу дала і падзелы дзяржавы.
А ўлада святкуе ў прыліве маны
Выхвальвае продкаў памылкі, няславы.
На плошчы праходзіць вялікі парад,
Фанфары іграюць дзяржаўныя гімны,
Святкуе імпрэзу з трыумфам урад
І чую ў прамовах хвальбу безупынна.
Не скажа ніхто колькі крыўды, бяды
Народу дала нашых продкаў бяздарнасць,
Якія аставіла людзям сляды
З прычыны памылкі людская каварнасць.
А ўрад паражэння святкуе часцей,
Замест святкаваць толькі дні перамогі,
Бо хоча свой твар паказаць для людзей,
Пацешыць з трыбун, каб не чулі трывогі.

## ДАБРАНАЧ

Дабранач! Засні, дарагая,
Убачыш чароўныя сны.
У сне, як краля маладая,
Ты будзеш між кветак вясны.
    Зачнеш ты на кветкавым лузе
    Плесці, як падлётак, вянкі,
    Глядзець, як лятаюць па крузе
    Навокал цябе матылькі.
А золатам промні з-за хмары
Абвяжуць твае валасы
І радасць з усмешкай на твары
Узмоцняць твой воблік красы.
    Пабачыш пасля дрэваў кроны,
    Захочаш пабегчы туды
    І песняй у лесе зялёным
    Цябе прывітаюць дразды.
Пагладзіць твае ў лесе ногі
Мох спырсканы свежай расой,
Пабачыш прыгожыя рогі
Аленяў за ціхай ракой.
    Прысніцца табе раптам мора
    І Залатыя пяскі.
    Падумаеш: мы тут учора
    Глядзелі на бераг марскі.
Прыпомніш ля хваль нашы ночы,
Як дзесьці ў тэатры ў фае.
Адкрыеш тады свае вочы,
Пачуўшы абдымкі мае.

## ЧАКАННЕ

На бляск вачэй тваіх жаночых,
На німб загару на чале,
Чакаюць смутна ўжо дзве ночы
Букеты кветак на стале.
    Чакаюць разам з імі побач
    Чарэшні, яблыкі, віно,
    Стаіць партрэт твой, як аздоба,
    Вісіць на крэсле кімано.
Наўкол стала чакаюць крэслы,
На твой прыём, на твой прыход,
Чакаюць на настрой узнёслы,
На мілы ўсім нам эпізод.
    Трумо ўвесь час глядзіць на дзверы,
    Так як іконы на алтар,
    Калі рассунуцца парцьеры
    І ў іх паявіцца той твар.
Калі яно ўвесь твой адбітак,
Твой светлы радасны настрой,
З усмешкі светлым каларытам
Табе пакажа ўраз са мной.
    Ужо ляжыць у нашай спальні
    Табе вядомая пасцель,
    Якую я з хімічнай пральні
    Прынёс. Чакае ў ложку бель.
Дзве ночы мы цябе чакаем,
А за акном у нас зіма.
І верым, прыдзеш ты жывая.
Чакаем, а цябе няма.

## БЕЛАРУСКІ ФЕНІКС

Уцешыў ты сяброў маіх наўкол,
Як з попелу радзіўся нечакана
І стаў лятаць над намі, як арол,
Хоць бачылі мы кроў тваю на ранах.
  Аднак загінуў страшны вораг твой,
  Які вякі трымаў цябе ў няволі,
  Другі стары заняты быў сабой,
  Імкнуўся каб знайсціся зноў на волі.
Загойваліся раны ўсе ў цябе,
Чуваць было, што будзеш лётаць вольны,
Мы верылі, што ў цяжкай барацьбе
Да перамогі біцца будзеш здольны.
  Паўстаўшы фенікс цешыў наш народ,
  Ды ворагаў між іх ты меў не мала,
  Яны рабілі сілкі многа год,
  Каб ты папаў у іх, як звер на джала.
Папаўся ты аднак у іх пятлю,
Лятаць, як птушка, не даюць свабоды,
Цягнуць цябе ўсёй сілай на зямлю,
Каб ты пачуў няволі ўсе нягоды.
  Не хочуць, каб ты ўбачыў сапраўды,
  Што аднялі ў людзей свабоду слова,
  Змушаюць, каб забыў ты назаўжды,
  Што можаш гаварыць на роднай мове.
Я думаю ў цябе ёсць многа сіл
Каб вырвацца з пятлі іх і няволі,
Што вылеціш ты зноў пад небасхіл
Надзею даць  на лепшую ўсім долю.

## ПРАЦА

Радзіўся я ў вясковай хаце,
З бярвён пастаўленым палацы
І ад дзяцінства меў я шчасце,
Што быў прывучаны да працы.
    Не пасвіў я кароў ніколі,
    Ды ім у хлеў прыносіў сена
    І бацьку памагаў у полі,
    На лузе ў гразі па калена.
Я потым меў заняткі ў школе,
Аж да ваеннай завірухі,
Пасля да працы ў падняволлі
Ганяў сабака віславухі.
    Я стаў нявольнікам работы,
    Жыву заўжды ў яе абдымках,
    Яна мне гоіць боль, журботы,
    З ёй чуюся, як цар на здымках.
Я ўжо свабодны, да работы
Мяне ніхто больш не змушае,
Яна ёсць лекам на самоту,
Мая сяброўка баявая.
    І прагну я яе палону,
    Пакуль тут маю волю, сілы.
    І для яе я б’ю паклоны,
    Кладу ёй ладан у кадзілы.
Яна ў жыцці мне памагае
Зрабіць маленькі след на свеце,
Які я ў кнігах астаўляю
Усім знаёмым на планеце.

## СКАЖЫ ВАРАЖБІТ

Скажы варажбіт, што чакае мяне?
Што ты прачытаў аба мне ў бляску зорак?
Ці доўга яшчэ жыць я буду ў мане,
Якая мяне акружае ў прасторы?
        Адкрый прышласць лёсу майго ў гушчары,
        Бо ён такі цёмны, што зрок мой прарочы
        Нічога не бачыць з бакоў і згары,
        Хоць вельмі напружваю ўдзень свае вочы.
Скажы, на старонках тваіх вешчых кніг
Напісана нешта аб будучым лёсе?
Ці ўбачу ў сваім жыцці радасны міг,
Які мне народзіць надзеі калоссе?
        Скажы прадказальнік, ці ў цемры вякоў
        Прыдзе час такі, што загіне няшчасце?
        Што людзі не будуць баяцца даўгоў?
        Што людзі не будуць ад голаду красці?
Скажы варажбіт, ці калісь Беларусь
Свабоднаю стане ў Еўропе дзяржавай?
Ці будзе ўладаць ёй народ, не тунгус,
Які не цікавы яе добрай славай?
        Скажы прадракальнік, ці мова бацькоў
        Займе ў нас пазіцыю мовы дзяржаўнай?
        Не будуць цурацца яе родных слоў?
        Выкідваць яе з устаноў беспадстаўна?
Скажы, ці ўсе сімвалы нашых падзей
Пагоня і сцяг наш бел-чырвона-белы
Згуртуе да подзвігаў нашых людзей,
Правадыроў дасць нам мудрых і смелых?

## НЕ СПЯШЫ

Ты паслухай, як сэрца стукоча ў цябе,
Быццам помпа гудзіць, як звон дзесь звініць,
Яно змучылася і хай б'ецца слабей.
Ты затрымай свой бег. Не спяшы! Адпачні!
        Ты наперад бяжыш, быццам гоніш кагось,
        І не ведаеш хто там бяжыць прад табой,
        Крок свой стрымай хутчэй! Не дагоніш яго.
        Ты пачуй гукі сэрца сваёю рукой.
Ты не думай, што свет без цябе прападзе,
Не пачуе ён нават, што стрымаў ты бег.
Вось цяпер на яго можаш сам паглядзець
І знайсці месца дзесь на спакойны начлег.
        Там прыпомніш свае маладыя гады,
        Як на лузе калісь ты лавіў матылькі,
        Як ты кветкі зрываў для дзяўчын маладых,
        А мажліва ім плёў з гэтых кветак вянкі.
Падарожжа прыпомніш да цёплых краін
І прыгоды, якія сустрэў ты тады,
І нямала вясёлых шчаслівых хвілін,
І нямілага стрэсу загінуць сляды.
        Не бяжы ўжо цяпер за багаццем сваім,
        Бо замучышся хутка, аставіш яго,
        І не будзе яно цябе цешыць зусім,
        Як не будзеш магчы варухнуць сам нагой.
А калі адпачнеш, набярэш новых сіл,
То падымешся зноў, каб наперад ісці.
І паможа з прыродай табе небасхіл,
У тваім бестурботным, спакойным жыцці.

## РОДНАЕ СЛОВА

Роднае слова, яго ад калыскі
Чуе ад маткі малое дзіця,
Чуе ў журчанні пяшчот мацярынскіх,
Чуе яго з гам яе пачуцця.
З матчыных чуе штодзень калыханак,
З песень, з размоы ад родных бацькоў
Чуе іх ноччу, ўдзень і ў світанак,
Вучыцца назвы ад іх родных слоў.
Потым уводзіць яно з мацярынства
У навакольны дзівосны іх свет,
Вучыць выказваць усё ў час дзяцінства
Крыўду і жаль і дзіцячы пратэст.
Роднае слова адкрые ім цуды
І таямніцы жыцця і падзей,
Бляскі ўсіх казак, легенд ізумруды?
Радасці з многіх фантазій, надзей.
Потым у школе яно ім паможа
Тайны ўсе выкрыць з запісаных кніг,
Нашай зямлі і прыроды прыгожасць.
Сэнс гістарычных падзей і інтрыг.
Словы адкрыюць ім скарбніцы думак
Розных народаў і нашых людзей,
Родную мову палюбяць і з сумам
Будуць на здраднікаў мовы глядзець.
Толькі чуць будуць яны ў роднай мове
Гукі чароўныя і прыгажосць,
Подыхі ветру ў ціхай дуброве,
Песні ўсіх птушак і маладосць.



1966 г. Судэцкія горы. Аўтар з сынам.

# ПОДЫХ ГІСТОРЫІ

## ДЗІЦЯЧЫЯ КРЫЖОВЫЯ ПАХОДЫ

Ва Францыі ў паход крыжовы
Павёў дзяцей Сцяпан з Клуа
Каб у арабаў Храм Хрыстовы
Забраць, для Рыма даравaць.
Прыхільнікам таго паходу
Быў папа рымскі[1], Ватыкан.
І дзеці ў слоту, ў непагоду,
Пайшлі, паверыўшы ў іх зман.
Ім мела расступіцца мора
І прапусціць па дне паход,
Ды іх спаткала толькі гора,
Разбіты бурай параход.
І тысячы дзяцей у хвалях
Забраў сабе марскі планктон,
А многа сотняў, як кефалі,
Арабам прадалі ў палон.
Другі паход дзяцей наіўных
Павёў зноў немец Мікалай,
Ён быў няўдалы і пасіўны,
Зманіў дзяцей ён, як гультай.
Частка дзяцей дайшла да Рыма
І папа іх благаславіў.
Як іх пабачыў, то магчыма
Пяты паход ён абвясціў.
Другі паход дзяцей таксама
Спаткаў, як першы, страшны лёс.
Аб іх пакутах, страшных драмах
Расказваў не адзін матрос.

[1] Папа рымскі Інакенцій III у 1212 г

## ВЯЛІКІ КНЯЗЬ МІНДОЎГ

З Наваградка пачаў ён паходы,
Як уцёк з сваім войскам з Літвы,
Наваградскі князь даў яму згоду,
Каб памочнікам быў баявым.
        Барацьбу з ім вялі кунігасы,
        Ды паволі ўсіх іх пакарыў.
        Праваслаўе прыняў з цягам часу
        І літоўскае княства стварыў.
Не адзін раз разбіў ён татараў.
Каб лівонцы не сталі пужаць
Каб не быць іх смяротнай ахвярай,
Ён згадзіўся католікам стаць.
        Ён карону прыняў з Ватыкана
        І літоўскім ён стаў каралём,
        Ды ўсё гэта зрабіў для падмана,
        І пасля яе скінуў на злом.
І да смерці ён быў праваслаўным,
Хоць язычніцкі нораў ён меў,
Забіваў ён людзей беспадстаўна
Для карысці ці чуючы гнеў.
        Жонку Марту забраў ён ад дзядзькі,[1]
        Муж яе згінуў з ім у баі,
        І сястру[2] яе ўзяў без аглядкі
        І ў палацы затрымаў сваім.
Давялі яго чыны да смерці,
І да помсты жамойцкіх князёў.
Нечакана ён мусіў памерці,
Згінуў ён і яго двух сыноў.

---

[1] Дзядзькя яго – князь Вісмант. Пасля смерці Вісманта Міндоўг ажаніўся з яго жонкай Мартай і меў з ёй двух сыноў, Рухлю і Рэпэку, якіх забіў разам з ім у час яго сну падкуплены загаворшчыкамі яго прыяцель Астап.

[2] Калі сястра Марты, жонка князя Даўмонта, прыехала на яе пахаванне, Міндоўг яе затрымаў, што давяло да помсты яе мужа з загаворшчыкамі і забойства вялікага князя Міндоўга.

## САРАНЧА

У Бібліі яе назвалі восьмай карай,
Якой калісьці Бог Егіпет пакараў,
Бо нападае на палі знянацку хмарай
І нішчыць іх, як полымя агню з кастра.
З'ядае ўсё наўкол пражэрная стыхія,
Бо не аставіць ні сцяблінкі кавылю,
А астаюцца слёзы горкія людскія,
Якія бачаць толькі голую раллю.
Як саранча, ішлі крыжовыя паходы,
У Палесціну адабраць Хрыста труну,
І па дарозе нішчылі людзей, народы,
І астаўлялі па сабе агню сцяну.
Яны змянялі гарады ўсе ў папялішчы,
Яны там астаўлялі горы мёртвых цел,
Руіны сцен, папаленыя ўсе замчышчы,
У грабяжы, разбоях, гвалтах свой удзел.
Сем раз пайшлі туды на заклік рымскіх папаў,
З крыжамі на плячах і з іменем Хрыста,
Замест любоў няслі кліч помсты ад сатрапаў
З-пад ватыканскага пражэрнага паста.
З васьмі паходаў з Рыма жорсткіх і крывавых
Адзін[1] на Візантыю здрадліва напаў,
Стварыў ганебную лацінскую дзяржаву
І Рым яе больш чым паўвека[2] рабаваў.
Таму памог ён туркам увайсці ў Еўропу,
Пасеяць на Балканах жорсткасць і іслам.
Амаль іх не пусціў да Рыма праз Радопы
І ў лапы іх аддаў труну Хрыста і храм.

[1] Чацвёрты крыжовы паход у 1204 г.
[2] З 1204 па 1261 год

## ПОМНІЦЬ БЕЛЬСКАЯ ЗЯМЛЯ

Помніць наша бельская зямля
Тупат ног яцвягаў, кіяўлян.
А пасля татараў, крыжакоў,
Як няслі пажары, смерць і кроў.
Бо да нас прыходзілі з мячом
І назад вярталіся з дабром.
        Кіеўская Русь прыйшла да нас,
        З святарамі прынясла іканастас,
        Цэрквы будавала для людзей,
        Каб хрысціць іх у святой вадзе.
        Увяла нам феадальны лад,
        Праваслаўны з Кіева абрад.
Потым ляхаў помніць, як наўкола
Будавалі для сябе касцёлы
І ксяндзоў прывозілі з сабою,
З голаю ад брытвы барадою,
З дзіўнаю малітвай па-латыні,
Замест жонак мелі гаспадыні.
        Ды была між імі доўга згода,
        Разам білі ворага ў паходах,
        Крыжаносцаў ці ліхіх татараў,
        Ці напаўшых аж з Масквы баяраў.
        Аж прыйшлі з-пад Рыма езуіты,
        Прынясл разлад, як паразіты.

# ІЛЖЭДАРАВАЛЬНЫ ЗАПІС КАНСТАНЦІНА

Фальсіфікатарскай заражаны пухлінай,
Калісь быў з рымскім папам цэлы Ватыкан,
Стварыў ён „Даравальны запіс Канстанціна”[1]
І праз стагоддзі ўводзіў ім людзей у зман.
    Бо кесар нібы за хрост яго Сільвестрампапам
    Ён рымскім папам Рым і цэлы Захад запісаў,
    Дазволіў імі кіраваць ім, як сатрапам,
    А сам у Візантыі ён манархам стаў.
І быццам бы ў тым запісе запісана манархам,
Што папа ёсць намеснікам апостала Пятра
І ён загад дае ўсім хрысціянскім патрыярхам
Каб велічалі папу ўсюды, як цара.
    Праз тысячу гадоў атрутнаю наліўкай
    Без сораму паіў увесь свет Ватыкан.
    Хаця Ларэнца Вала[2] даўно адкрыў фальшыўку,
    Нядаўна Рым прызнаўся, што гэта быў падман.
Падробак ватыканскіх цяпер раскрылі многа,
Яны амаль усе ў лжэзборнік[3] увайшлі,
Тварылі ў ім фальшыўкі, быццам бы для Бога,
Каб толькі ўладу Рыма людзі знали на зямлі.
    То прага ўлады над усімі Ватыкана
    Была прычынай тых падробак, многіх бед,
    Яго пражорлівасць радзіла нестрымана
    Насіллі, інквізіцыі крывавы след.
Адтуль ішлі ўвесь час крыжовыя паходы,
Якія людзям жах і смерць няслі наўкол,
Ад іх загінулі свабодныя народы,
Якіх не зачароўваў папскі арэол.

---

[1] „Ілжэдаравальны запіс Канстанціна”(т.зв. „Дар Канстанціна”) быў сфабрыкаваны ў Ватыкане ў другой палове VIII ст. У ім запісана, быццам бы кесар Канстанцін Вялікі (274?-337) за яго хрост і выздараўленне ад слепаты папам Сільвестрам (314-335), запісаў рымскім папам уладу над Рымам, Італіяй і цэлым Захадам.

Так званы „Дар Канстанціна” прызнаў рымскага папу, быццам бы, „наместнікам Хрыста”, і „наследнікам апостала Пятра”, які быццам быў распяты ў Рыме, (на што няма гістарычных доказаў) і таму рымскі папа меў быць больш важным, чым патрыярхі Антыёхіі, Александрыі, Ерусаліма і Канстанцінопаля і, што рымскі папа павінен мець такую самую ўладу і прывілеі, як кесар, і рымскага папу таксама ўсе павінны велічаць, як кесара, бо быццам трон папы ў Рыме з’яўляецца вышэйшым за імператарскі, а сенатарскія становішчы павінны займаць духоўныя, якія належаць да Рымскай царквы. У гэты фальсіфікат паверылі тады нават прадстаўнікі ўсходніх праваслаўных веравызнанняў. Ён даў у той час свецкай уладзе рымскага папы законную падставу падпарадкаваць яму ўсю ўладу ў Заходняй імперыі. Каталіцызм стаў дзяржаўным веравызнаннем.

[2] Ларэнца Вала (1405 ці 1407-1454) італьянскі гуманіст даказаў, што „Дар Канстанціна” з’яўляецца фальсіфікатам. Ватыкан да гэтага прызнаўся толькі ў XIX ст.

[3] „Ілжэісідараўскі сборнік” папскіх канонаў каталіцкага касцёла, які паўстаў у палове IX ст., дзе знаходзіцца вельмі многа сфабрыкаваных ў Ватыкане фальшывых дакументаў. У ім знаходзіцца таксама „Ілжэдаравальны запіс Канстанціна”. Як падае „Слоўнік Хрысціянскай Царквы” (Оксфорд, Нью Ёрк,1987, ст.189) ад папы Сільвестра I (памёр у 335 г.) да папы Рыгора II (памёр у 731 г.) зроблена было 35 фальсіфікатаў, якія галоўным чынам прыпісвалі ранні аўтарытэт папы і папскую супрэмацыю. Сапраўды кесар Канстанцін прыняў хрост перад самай смерцю ў 337 г., у Канстанцінопалі, калі рымскі папа Сільвестр ужо памёр і хрысціў яго мясцовы епіскап. Папа Сільвестр у Канстанцінопалі ніколі не быў, нават не быў запрошаны Канстанцінам Вялікім у 325 г. на першы ўсесяленскі хрысціянскі сабор у Нікею.



1990 г. Беласток, Аўтар з унукамі.

## СОФ'Я ГАЛЬШАНСКАЯ
## (каля 1405 – 1461 гг)

Маладая беларуская князёўна
Стала жонкаю старога караля[1].
Як Атэла з ёю чуўся ён няпэўна,
Стаў прыпісваць ён ёй здраду спакваля.
Ён абвінаваціў рыцараў прыдворных,
Што кахаліся ўсе з жонкаю яго.
Арыштаваў іх і мучыў непакорных,
Каб прызналіся да вычварных грахоў.
Не прызнаўся не адзін з тых катаваных,
Што меў з жонкаю яго якісь раман,
Адпусціў тады кароль арыштаваных
І развеяўся яго кашмарны зман.
Хоць тры жонкі меў Ягайла перад ёю[2],
Не дала яму патомка ні адна,
І паверыў ён варожцы пад царквою,
Што нашчадка маладая дасць княжна.
Нарадзіць яму пасля паспела жонка
Пры жыцці сумесным нават трох сыноў[3].
А палякі называлі Соф'ю Сонькай,
Да айчыны бачылі яе любоў.
Не магла яна сыноў быць апякункай,
Не дазволілі магнаты і паны,
Не хацелі, каб іх маткі пацалункі
Сталі лекамі сынам ад злой маны.
Сын другі памёр у Соф'і вельмі хутка,
А пад Варнай згінуў першы сын яе,
Верыла яна, што сын жыве і ў смутку
Прачакала на яго жыццё свае.

---

[1] У 1422г. выйшла замуж за польскага караля У. Ягайлу.
[2] Першая – Ядвіга, польская каралева, дачка Венгерскага Людвіка, другая – Анна, дачка Вільгельма, трэцяя – удава Елізавета з Піліцы, Граноўская.
[3] Першы – Уладзіслаў (1424-1444), другі – Казімір (16.05.1426-02.03.1427), трэці – Казімір (1427 - 1492).

## АЛЯКСАНДРА БРАЧЫСЛАЎНА
## (каля 1220 – пасля 1263 гг.)

Прыгажуня з Полацка, князёўна,
З князям ноўгарадскім Аляксандрам[1]
У царкве ў Тарапцы[2] шлюб царкоўны
Узялі між жывых алеандраў.
І пасля гарадскога вяселля
Шлюб у Ноўгарадзе святкавалі,
Каб там жыхары іх наваселля
Жонку князя свайго лепш пазналі.
Палюбілі яны ўсе княгіню,
Дабрачыннасць яе, асцярожнасць
І прыгожую, быццам багіню,
І яе дабрату і набожнасць.
Бо кахала яна свайго мужа,
Хоць, як воін ён быў непаседам,
І дрыжэла, як выйшаў у сцюжу,
Каб разбіць на Няве грозных шведаў.
Адагнаць крыжакоў аж з-пад Пскова,
Патапіць злых лівонцаў на лёдзе[3].
І малілася, каб выпадкова
Муж не згінуў у нейкім паходзе.
Трох сыноў нарадзіла для мужа[4],
І ў дадатак дачку, Еўдакію.
І цвіла, як чароўная ружа,
Разам з імі ў вайну і ў стыхію.
Як памёр муж на шляху зваротным
Ад татарскай атруты заўчасна,
Адышла ў манастыр бестурботна,
Аляксандру змяніла на Васу[5].

---

[1] Аляксандр(1220-1263) – сын Яраслава Усеваладавіча, вялікага князя уладзімірскага, князь ноўгарадскі, пасля перамогі на Няве над шведамі ў 1240 г. названы Аляксандрам Неўскім.
[2] Тарапец – горад ля Вялікіх Лукаў. Шлюб узялі ў 1239 г.
[3] На лёдзе на Чудскім возеры ў 1242 г.
[4] Дзмітрыя, Андрэя, Данілу.
[5] Аляксандра ў манастыры прыняла імя Васа.

# ГАННА КОБРЫНСКАЯ
# (каля 1460 – 1519 гг).

Не знала князёўна аб змове ў час шлюбу,
Што згінуць з рук мужа меў князь Казімір[1],
А потым паўстанне падняць меў муж любы
І Кобрын аддаць для Масквы ў сувенір.
І Ганна кахала яго апантана,
Кахала, як слаўнага багатыра.
Была сваім Фёдарам[2] зачаравана,
Калі даў пярсцёнак ёй ля алтара.
Ды змову іх здрадзіў хтось для Казіміра,
Муж Ганны аб здрадзе пачуў наяву,
За змову партнёраў чакала сякера[3],
І раніцай Фёдар уцёк у Маскву.
Маскоўскі Іван князь прыняў яго шчыра,
І Мораў і Дземен яму падарыў,
Аднак адчуваў ён сябе дэзерцірам,
За жонкаю Ганнай ён моцна тужыў.
І Ганна таксама тужыла за мужам,
Яе, як заложніцу, меў Казімір,
Чакаў, што прыдзе да яе ён у сцюжу,
Ці з'явіцца летам, як цёплы зефір.
Не мог даравацъ Казімір яго змовы,
І ў Кобрыне плаха чакала яго,
А князь Іван трэці таксама суровы
Яго прытрымаў ля сваіх берагоў.
Яго ажаніў ён з князёўнай Разанскай,
Якая радзіла яму трох сыноў,
І браў ён удзел у паходзе казанскім,
А потым памёр між чужых цівуноў[4].
Атрымаўшы вестку пра смерць свайго мужа,
Рашыліся Ганна і Вацлаў на шлюб[5].
Забрала ёй розум другое замужжа.
Яе муж тыраніў, як самалюб.

---

[1] Казімір Ягайлавіч (1440-1490).
[2] Фёдар Бельскі. Змова была ў 1381 г.
[3] Змоўшчыкі Міхаіл Алелькавіч Слуцкі і Іван Гальшанскі
былі пакараны смерцю ў Вільні 30.08.1381 г.
[4] У 1506 г.
[5] У 1507 г. з маршалкам Вацлавам Касцевічам.

## АНАСТАСІЯ АЛЕЛЬКАВІЧ
## (каля 1475 – 1524 гг.)

Княгіня ў даспехах з мячом на кані,
Жыла, як легенда, далёкіх падзей.
У бітвах з татарамі ў грозныя дні,
Была абаронцай ад смерці людзей.
Каханы яе муж, князь слуцкі, Сямён
Разбіў раз татараў ля рэчкі Ушы,
За гэта хан Батый адпомсціць рашыў
У Слуцку ўзяць штурмам хацеў бастыён.
Адбілі случчане іх сотні атак
І змусілі хана вярнуцца на Крым[1].
Пачула княгіня, хто грозны хіжак,
Зноў прыйдзе змяніць іх дамы ўсе ў кастры.
Тады заказала кальчугу і меч,
Каб мужу свайму памагчы ў час бяды.
Зімою яму памагла сапраўды:
Разбіўшы татараў знянацку, як смерч.
Для мужа дала яна сына з дачкой[2],
Выхоўвала іх, як грымела карцеч,
Як муж ёй памёр ад хваробы ліхой,
Татараў біў часта яе востры меч.
На Слуцк нападалі татары не раз,
Рабілі падкопы глыбока ў зямлі,
Ды замка яе захапіць не змаглі,
На Крым уцякалі пасля ўсіх параз.

---

[1] У 1502 г.
[2] Сын Юрый нарадзіўся у 1492 г., а дачка Аляксандра ў 1504 г.?

# ЗМЕСТ

## ПОДЫХІ МІНУЛАГА

Мы не сустрэнемся ... 5
Альбі ... 6
Сцяжына жыцця ... 7
Спеў дзяўчыны ў садзе ... 8
Рэха гадоў ... 9
У зараслях чаромхі ... 10
На Івана Купалы ... 11
Даваеннае пакаленне ... 12
Дзіўны сон ... 13
Студні ... 14
Вёска дзяцінства ... 15
Мае дзяды ... 16
Чаму не прыязджаеш? ... 17
Паржавелыя чыгункі Падляшша ... 18
Дажджлівы дзень ... 19
Вясенні снег ... 20
Бяздомны ... 21
Лясы на Падляшшы ... 22
Шукалі брам раю ... 23
Яны паверылі ... 24
Яна голасна цешыцца ... 25
Старыя песні Падляшша ... 26
Рачная перашкода ... 27
У сне бачу родную вёску ... 28
У Грэцыі ... 29
Выгнанне з айчыны ... 30
Расчараванне ... 31
Надзея ... 32
Мой „Дзень перамогі” ... 33
Суніцы ... 34
Сустрэча з М.К. ... 35
Талтсман ... 36
Балатон ... 37
Самалёты ... 38
Шуканне лёсу ... 39
Спрадвечныя ўспаміны ... 40
Рэмінісцэнцыі ... 41
Варшава ... 42

Ноччу за вёскай .......... 43
Церабунь .......... 44

## ПОДЫХІ ЗЛА

Зло .......... 45
Ахвяры за свабоду .......... 46
Рабы сатрапаў .......... 47
Праверка віны .......... 48
Кдяймуйце .......... 49
Метамарфозы бяздомнага .......... 50
Ясеновац .......... 51
Воўк асіміляцыі .......... 53
Палітыкі на п’едэсталах .......... 54
Свята перамогі .......... 55
Манія багацця .......... 56

## ПОДЫХІ ПРЫРОДЫ

Перапёлкі .......... 57
Старыя цярпенні .......... 58
Венера .......... 59
Перламутравы дзень .......... 60
Сэнс жыцця .......... 61
Захапляйся .......... 62
Начная музыка .......... 63
Захапленне сабой .......... 64
Пошук ветрам далячынь .......... 65
Паклоны .......... 66
Воблакі .......... 67
Колеры свету ў мроях .......... 68
Ці апакаліпсіс? .......... 69
У агародзе .......... 70
Позняй восенню .......... 71
Сусвет .......... 72
Валошкі .......... 73
Вячэрні час .......... 74
Крокусы .......... 75

## РЭФЛЕКСІІ

Пакуль... 77
Глядзім з надзеяй 78
Кую 79
Свята свайго паражэння 80
Дабранач 81
Чаканне 82
Беларускі фенікс 83
Праца 84
Скажы варажбіт 85
Не спяшы 86
Роднае слова 87

## ПОДЫХІ ГІСТОРЫІ

Дзіцячыя крыжовыя паходы 89
Вялікі князь Міндоўг 90
Саранча 91
Помніць бельская зямля 92
Ілжэдаравальны запіс Канстанціна 93
Саф'я Гальшанская 95
Аляксандра Брачыслаўна 96
Ганна Кобрынская 97
Анастасія Алелькавіч 98



2008. 06.29.Аўтар з Г. Валкавыцкім.



1968 г. Бялград. Жонка аўтара і аўтар  перад Скупшчынай.



1973 г.Парк у гор.Пушкін ля Ленінграда.
Жонка аўтара, аўтар і Алена Кірэева.

**БІБЛІЯТЭКА**
Беларускага літаратурнага аб'яднання
**„БЕЛАВЕЖА"**

Серыя заснаваная ў 1990 г.

Кніжка шэсцьдзесят сёмая

Рэдактар
*Віктар Швед*

© Copyright by Dymitr Szatyłowicz 2009

ISBN 978-83-7657-060-0

Wydawnictwo
**PRYMAT**
Mariusz Śliwowski
Białystok ul. Zwycięstwa 26Clok. 7
tel. (085) 869 14 87, 0602 766 304
www.prymat.stnet.pl, e-mail: prymat@stnet.pl